незалежная газета
№ 34 (679) 8 верасня 2010
www.nn.by
# Наша Ніва
ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Пасольства падпалілі анархісты?

Старонка 4



## Сям'я Латыпавых

Старонка 5




## Гісторыя Беларусі. Рагвалод: з Нарвегії ў Полацк

Старонка 12

### У НУМАРЫ

**Кола кандыдатаў у прэзідэнты звужаецца**
Сто тысяч подпісаў зможа сабраць адзін ці, у лепшым выпадку, два супернікі Лукашэнкі. І той адзін заявіў пра ўдзел у выбарах з Масквы. **Старонка 3.**

**Пазняк пра мову: наркамаўка ці тарашкевіца?**
Нацыя пад прэсам шукае аптымальнае рашэнне. **Старонка 10.**

**Сырок разладу**
Вучняў са шматдзетных сем'яў у школах кормяць інакш, чым астатніх. **Старонка 7.**

**Пакарэнне Парыжа**
Сенсацыйная перамога над французамі адкрыла перад футбалістамі Беларусі ўнікальны шанец. **Старонка 6.**

**Малодшы брат Глобуса**
Ён вырас у сям'і беларускага пісьменніка, а выдае расійскія кнігі. **Старонка 11.**

**Калі мужчына перастае думаць пра сэкс**
Чаму гэта адбываецца — муж не хоча займацца сэксам з жонкай? **Старонка 13.**

**Ліду да Дажынак будуюць в'етнамцы**
На ўсе нашы пытанні яны адказвалі завучанай фразай: «Не панемать па-рускі». **Старонка 7.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Страшная смерць Алега Бябеніна

**3 верасня кіраўніка найбуйнейшага апазіцыйнага сайта charter97.org знайшлі ў пятлі на ўласнай дачы.**

Следства адразу загаварыла пра самагубства. Сваякі і сябры ўпэўненыя: «Забілі». Хто?

Паводле афіцыйнай версіі, цела журналіста Алега Бябеніна знайшлі ў пятніцу 3 верасня прыблізна ў 19.00 на яго дачы ў вёсцы Пярхурава ў Дзяржынскім раёне.

Бябенін вісеў на самаробнай пятлі, прымацаванай да сходавага пралёту, які вядзе на другі паверх дома. Побач ляжаў табурэт.

Прэс-сакратар МУС адразу акцэнтаваў увагу на тым, што пры аглядзе дома эксперты знайшлі дзве пустыя бутэлькі з-пад спіртнога напою «Беларускі бальзам».

Судмедэкспертыза не выявіла ніякіх пашкоджанняў на целе, акрамя странгуляцыйнай баразны ад пятлі. Слядоў барацьбы — ніякіх, але ніякай і перадсмяротнай запіскі.

**Працяг на старонцы 8.**




З АРХІВА МІКАЛАЯ ХАЛЕЗІНА

**Алег Бябенін**

**нарадзіўся ў 1974. Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1990-х гадах працаваў намеснікам галоўнага рэдактара незалежнай газеты «Імя». У 1998 годзе заснаваў інтэрнэт-сайт charter97.org. У Алега Бябеніна засталіся жонка і двое сыноў.**

• «Ён нагамі стаяў на падлозе. Не вісеў, а ўпіраўся нагамі ў падлогу...».
• Жыхары вёскі Пярхурава: «Ніякага крыміналу ў нас ніколі не было».
• Злавесны знак усім нам. Версіі смерці Алега Бябеніна.
• «Яшчэ адзін артыкул, і табе п...ц».
• Якім палітычным мэтам магла служыць расправа над Бябеніным? Каментар Рэдакцыі.
Старонкі 8—9.

# Лукашэнка памяняў сабе дзень нараджэння на той самы з Міколкавым

**Раней днём нараджэння кіраўніка краіны лічылася 30 жніўня, ад сёлета стала 31-га.**

31 жніўня ў вечаровых навінах тэлеканалы паведамілі, што Аляксандр Лукашэнка і яго малодшы сын Мікалай адзначылі сумесны дзень нараджэння. Аказалася, што гэта не памылка журналістаў. Да сёлета Аляксандр Лукашэнка прымаў віншаванні 30 жніўня, а цяпер на афіцыйнай старонцы кіраўніка дзяржавы пазначана, што «нарадзіўся А.Р. Лукашэнка 31 жніўня 1954 года ў гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобласці».

Кіраўнікі замежных дзяржаў віншавалі Аляксандра Лукашэнку з днём нараджэння менавіта 30 жніўня. Такі сёлета па старой завядзёнцы Лукашэнку з днём нараджэння павіншавалі Віктар Януковіч, Генадзь Зюганаў. Дарэчы, віншавання ад кіраўніцтва Расіі ён так і не дачакаўся.

Спачатку ў прэс-службе Лукашэнкі ішлі ў «несазнанку». Маўляў, не мяняў кіраўнік сабе дату нараджэння, а заўсёды было 31-га. Потым усё ж давялося патлумачыць. Афіцыйная версія гучыць так: маці Аляксандра Лукашэнкі паступіла ў радзільню 30 жніўня вечарам, але нарадзіла ў ноч з 30-га на 31-е.

«У 50-я гады ў раддамах у сельскай мясцовасці, зразумела, ніхто з секундамерам не стаяў, і дакладны час нараджэння дзіцяці не адзначаўся. І нованароджанага запісалі на 30 жніўня, па даце паступлення парадзіхі ў раддом», — сказаў сураразмоўца ў Адміністрацыі прэзідэнта.

**Працяг на старонцы 3.**



**8 верасня — Дзень беларускай вайсковай славы**

Рэдакцыя віншуе ўсіх патрыётаў і патрыётак з гэтым святам. Жадаем быць мужнымі і верыць у свае сілы — гэта дапамагло продкам перамагчы пад Оршай.

# Коні, людзі, крылы

**Выстава «Зямля пад белымі крыламі» ў Мастацкім — самая відовішчная за год. І савецкая. Піша Гары Куманецкі.**




**Дырэктар Мастацкага музея асабіста прэзентаваў выставу міністру культуры Паўлу Латушку (справа).**

3 верасня ў Мастацкім музеі распачалася выстава «Зямля пад белымі крыламі». Да 15 снежня Міністэрства культуры Беларусі мае намер правесці па ўсёй краіне некалькі выставаў у межах гэтага праекта, што мае вызначыць дзяржаўную палітыку ў галіне выяўленчага мастацтва.

Што скажаш, «Харошкі» спяваюць і танчаць выдатна. І іх было чуваць ужо за квартал да Нацыянальнага мастацкага музея, дзе адбывалася ўрачыстае адкрыццё новай вялікай выставы «Зямля пад белымі крыламі».

Зачараваныя гукамі народных спеваў, сюды прыйшлі мастакі і мастацтвазнаўцы, дыпламаты і чыноўнікі . Ім ужо на маршах парадных сходаў музея «Харошкі» ў шыкоўных сцэнічных уборах раптам праспявалі калядную шчадроўку. А затым адпалілі «Люлечку» — тую, «калупалку-стукалку», што варта было расцаніць як рэкламу аднаго з галоўных спонсараў музея, кампаніі British American Tobacco. Бо паіншаму пранікнёны мужчынскі спеў пра дымную люлечку ў Мастацкім музеі зразумець немагчыма...

Такім чынам, самая маштабная дзея года ў выяўленчым мастацтве краіны пачалася. Назву для гэтай шматчасткавай акцыі, у межах якой пройдзе некалькі выставаў, дала славутая аднайменная кніга Уладзіміра Караткевіча — «Зямля пад белымі крыламі».

Выстава з гэткай самай назваю ўжо праходзіла ў Мінску 5 гадоў таму ў Палацы мастацтва і была прысвечаная 75-годдзю пісьменніка. Але тады выставу з уласнае ініцыятывы ладзіла мастакоўская суполка «Пагоня».

Сёлета мы адзначаем 80-годдзе Караткевіча. Таму выстава «Зямля пад белымі крыламі», што прадставіць усю палітру нашага сучаснага мастацтва, — даніна генію. Гэта так уяўлялася...

Экспазіцыя насамрэч шырока прадстаўляе беларускае мастацтва, што яшчэ не страціла дзяржаўную падтрымку. Наведнікі ўбачаць звыш трох соцень работ, створаных амаль 150 аўтарамі.

Удалася афіцыйная дэманстрацыя работ сучасных аўтараў усіх жанраў — ад жывапісу да дэкаратыўнаўжытковага мастацтва. Бадай, такі маштаб зададзены ўпершыню не толькі ў гісторыі музея, але і беларускай дзяржавы.

Выстава не толькі сабрала творы слынных майстроў, але спрабуе прасачыць тэндэнцыі развіцця нашага мастацтва, традыцыю, перададзеную маладзейшым майстрам, якім сёння пад трыццаць. Выйшла пафасна і прадстаўніча: палотны Леаніда Шчамялёва з лятучымі коньмі і гурбамі снегу, Мая Данцыга, Віктара Грамыкі побач са скульптурнымі партрэтамі інтэлігенцыі і касманаўтаў.

На гэтак званай Верхняй галерэі выстаўленыя творы народных мастакоў, лаўрэатаў савецкіх і тутэйшых Дзяржаўных прэміяў — ад Гаўрылы Вашчанкі да Міхала Савіцкага. Тутсама паказваецца і графіка 1980-х: Славука, Шаранговіча, Савіча, які цяпер ачольвае Саюз мастакоў.

Варта аддаць належнае Арлену Кашкурэвічу, які адзіны прадставіў на галерэі сваю найноўшую, сённяшнюю творчасць, а не старыя творы.

Паколькі імя Караткевіча, у якога пазычылі чыноўнікі назву, нідзе не прагучала, то і шукаць партрэтаў ягоных ці ілюстрацыяў да ягоных твораў было тут марным заняткам. Зрэшты, і пачуць штосьці скрозь музыку «Харошак» было цяжкавата...

Марна тут шукаць і сучаснае беларускае мастацтва. Экспазіцыя эклектычная, не знітаваная ані храналагічна, ані тэматычна. Палотны і скульптуры, у большасці, створаныя яшчэ ў савецкія гады.

Вяршыня чынавенскага гумару — палатно Стальмашонка «Ленін з моладдзю» 1967 года!

Дэклараванай напярэдадні задачы — прэзентаваць цяперашняе наша мастацтва за апошнія два дзясяткі гадоў — арганізатары не вырашылі.

Выстава выйшла незвычайна маштабнай, вельмі змястоўнай і ...глыбока савецкай.

Прытым арганізатары выбралі для выставы толькі творы яшчэ жывых творцаў. Хоць, калі ўжо выстаўляць усё запар, ад 1960-х гадоў, чаму б не прадставіць і тых, хто нас пакінуў у апошнія два дзясяткі гадоў, напрыклад, Аляксандра Кішчанку ці Віталя Цвірку?

**Працяг на старонцы 11.**

## Сцісла

• **Сурыкаў: «стратэгічных спрэчак» па газавым пытанні не будзе.** «Газавыя кантракты падпісаныя на пяць гадоў, уключна з 2011 годам. З якой нагоды перамовы, калі кантракты падпісаныя? Умовы паставак агавораны», — сказаў пасол Расіі. Ён таксама адзначыў, што пасля апошняга газавага канфлікту Беларусь аплачвае пастаўкі строга ў адпаведнасці з кантрактам.

• **БХД знайшла памяшканне для з'езда.** Чарговая спроба ўстаноўчага з'езда Беларускай хрысціянскай дэмакратыі пройдзе 12 верасня. Месцам правядзення будзе Палац культуры МТЗ, паведаміў сустаршыня партыі Павел Севярынец. Асноўная мэта з'езда — вызначыцца са стратэгіяй выбарчай кампаніі БХД. Па выніках у Мінюст будуць ізноў пададзеныя дакументы на рэгістрацыю. Дзве папярэднія спробы былі няўдалымі.

• **Бабіна лета.** Паводле гідраметэацэнтра, 9—10 верасня будзе хмарна, пераважна без ападкаў. У асобных раёнах туман. Ноччу па паўночным усходзе на глебе месцамі замаразкі да 0 — мінус 2°С; днём плюс 13—20°С. 10 верасня ў паўднёва-заходняй палове краіны магчымыя дажджы і навальніцы.

• **На МКАД сутыкнуліся дзевяць легкавікоў і аўтобус.** Прычынай буйной аварыі стаў звычайны камень. ДТЗ здарылася на вонкавым коле МКАД, паміж Партызанскім праспектам і вул. Прамысловай. Утварыўся вялізны затор. Сутыкнуліся дзевяць машын. Дзясятым быў аўтобус без пасажыраў. У аварыі ніхто не пацярпеў. Над кальцавой праязджаў чыгуначны састаў, з нейкай прычыны адтульываліўся камень, проста на машыну. Ад нечаканасці кіроўца затармазіў, і адбылася ланцуговая рэакцыя: аўтамабілі, якія ехалі ззаду, не паспявалі спыніцца і ўразаліся адзін у адзін.

**ЗП, СМ**

## Беларускі Калегіум

Прапануе дадатковае навучанне па спецыялізацыях **журналістыка**, **найноўшая гісторыя**, **філасофія/літаратура**, а таксама — адмысловы набор на спецкурс па фатаграфіі.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У выключных выпадках прымаюцца студэнты малодшых курсаў. Навучэнцамі БК могуць быць тыя, хто пастаянна альбо на час навучання пражывае ў Мінску. Навучальныя праграмы БК арыентаваныя на выкладанне найноўшых фрагментаў сучаснай веды і не дублююць існуючыя праграмы дзяржаўных і недзяржаўных універсітэтаў. Сертыфікат Калегіума не замяняе дыплом аб вышэйшай адукацыі. Навучанне ў БК — бясплатнае. Пачатак заняткаў з 4 кастрычніка 2010 г. Заяўкі прымаюцца па 25 верасня б.г.

**Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па т.:** (29) 276–27–15, (29) 679–26–82 ад 14.00 да 18.00 (акрамя суботы і нядзелі) ці праз kalehium@gmail.com.

## Самае чытанае на nn.by за 1—7 верасня

- Забойства? Кіраўнік сайта charter97.org знойдзены ў пятлі
- «Ён нагамі стаяў на падлозе. Не вісеў, а ўпіраўся нагамі ў падлогу»
- Міс Грудзі Беларусі
- Зянон Пазняк пра кандыдатаў, Расію і «Хроснага Бацьку»
- Наркамаўка ці тарашкевіца?
- Лукашэнка памяняў сабе дзень нараджэння на той самы з Міколкавым
- 1 верасня ў беларускамоўнай гімназіі №23
- У Маскве былыя міліцыянты суткі гвалтавалі беларуску
- Францыя — Беларусь 0:1
- Напад на ІЧУ на Акрэсціна

## nn@nn.by
### Ці з'явяцца беларускамоўныя кінастужкі?

Ці наступяць такія часы? Што для гэтага патрэбна? Ці, каб не пакрыўдзіць расійцаў і паважаць беларусаў, фільмы трэба здымаць нямымі?

**Сяргей Норман, Мінск**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,
якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Але Х., Іллю Х., Марыі М., Вользе М., Андрэю Б., А.П., В.Ц., Мікалаю К., Сяргею А., В.М., Людміле Л., Вользе К., В.Л., Анатолю К., Аляксандру С., В.А., Валянціне В., В.Р., Яўгену І., Іраідзе З., Валянціне Дз., Г.Ш., М.П., В.Р., Сяргею Я., В.Н., А.Б., Аляксандру С., Ірыне Г., І.З., Уладзіміру Б., Віктару С., Вячаславу Б., Валянціне П., Але К., Раману М., Віктару Д., Валянціне Н., Але Р. з Мінска.

# Лукашэнка памяняў сабе дзень нараджэння на той самы з Міколкавым

Працяг са старонкі 1.

«Ад таго, што прэзідэнт з прахалодай ставіцца да гэтага свята, ён не надаваў яму значэння да моманту нараджэння малодшага сына Мікалая, які з'явіўся на свет 31 жніўня. А пасля нараджэння Мікалая Лукашэнка пачаў цікавіцца ў маці падрабязнасцямі свайго з'яўлення на свет і высветліў, што фактычна адзначаць дзень нараджэння трэба 31 жніўня».

Пісьменнік і гісторык Уладзімір Арлоў зазначыў, што ніколі дагэтуль пра падобныя выпадкі не чуў. У інтэрнэце з'явіліся меркаванні, што памяняць дату нараджэння Лукашэнку параілі масоны, каб змяніць свой лёс.

Журналісты звярталіся ў пашпартныя сталы і ЗАГСы, каб пацікавіцца, ці магчыма простаму чалавеку змяніць дату нараджэння. Паўсюль адказвалі катэгарычнай адмовай.

Што ўласна да Мікалая Аляксандравіча, якому ў апошні дзень лета споўнілася 6 гадоў, то ў школу ён яшчэ не пайшоў. Адкрываючы школу ў пасёлку Бараўляны (Мінскі раён), Лукашэнка зазначыў, што ягоны малодшы сын адмаўляецца пакуль ісці навучацца.

«Сказаў, што пойдзе толькі са мной», — падзяліўся Лукашэнка прыватным жыццём з іншымі бацькамі падчас «салодкага стала» ў Бараўлянах.

**Зміцер Панкавец**

# Кола кандыдатаў у прэзідэнты звужаецца

### Сто тысяч подпісаў зможа сабраць адзін ці, у лепшым выпадку, два супернікі Лукашэнкі. І той адзін заявіў пра ўдзел у выбарах з Масквы.

Лідар грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў заявіў пра свой намер удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. Гэтую заяву ён зрабіў у эфіры радыёстанцыі «Эхо Москвы».

«Так што, калі выбары будуць абвешчаныя сёння, мы гатовыя да таго, каб гэтыя сто тысяч подпісаў сабраць. Мы збяром больш. Мільён мы збіраць, вядома, не будзем, гэта насамрэч непатрэбна. Але неабходны запас, каб выключыць усялякія выпадковасці, мы зробім», — кажа Някляеў.

Сапраўды, на сёння выглядае, што ва Уладзіміра Някляева якраз і ёсць самыя вялікія шанцы сабраць неабходную колькасць подпісаў для рэгістрацыі.

Удзельнік выбараў 2006 года Аляксандр Мілінкевіч, хутчэй за ўсё, сёлета ў прэзідэнцкай кампаніі ўдзельнічаць не будзе. Адпаведная заява палітыка чакаецца цягам бліжэйшых тыдняў.

Выглядае, што частку людскога актыву Мілінкевіча перацягне да сябе малады Алесь Міхалевіч. Ён мае цвёрды намер пачынаць збор подпісаў, але ці назбірае — гэта ўжо іншае пытанне.

Магчыма, рызыкне акунуцца ў прэзідэнцкую кампанію і Партыя БНФ. Не факт, што каманда Рыгора Кастусёва зможа сабраць неабходную колькасць подпісаў, але вобраз у дзядзькі Рыгора прывабны.

Што датычыць кандыдата ад АГП Яраслава Раманчука, то найбольш імаверным выглядае варыянт зняцця ягонай кандыдатуры на карысць Уладзіміра Някляева. Невядома толькі, калі гэта адбудзецца: да пачатку збору подпісаў ці ўжо пасля. Шараговыя актывісты АГП склалі базу для «Гавары праўду».

Яшчэ не ясная да канца перспектыва кандыдата ад БХД Віталя Рымашэўскага. На сходзе актыву лідары хадэкаў намякалі, што не маюць дастатковай колькасці людзей для паўнавартаснай кампаніі. Напэўна, канчатковае рашэнне будзе прынятае на з'ездзе партыі. Ці адважацца хрысціянскія дэмакраты ўцягнуцца ў кампанію? Вылучыць кандыдата і не сабраць подпісаў — дыскрэдытацыя для палітычнай сілы.

### Пасля трагічнай смерці Бябеніна перад Саннікавым паўстае маральны абавязак пайсці ў кампаніі да канца.

Што датычыць Андрэя Саннікава, то тут яснасці яшчэ меней. Ходзяць чуткі, што бліжэйшым часам ён следам за Мілінкевічам таксама адмовіцца ад удзелу. Нягледзячы на ўласную актыўнасць у медыях і ясную, чытэльную праграму, Саннікаў, падобна, так і не змог заручыцца значнай чалавечай і фінансавай падтрымкаю.

Аднак пасля трагічнай смерці Алега Бябеніна перад Саннікавым паўстае маральны абавязак пайсці ў кампаніі да канца.

Генерал Валеры Фралоў у апошніх інтэрв'ю таксама намякаў на сыход з дыстанцыі.

Такім чынам, выглядае на тое, што неабходныя сто тысяч подпісаў зможа назбіраць толькі адзін, пры ўдалым збегу абставінаў — два, апазіцыйныя кандыдаты. Яшчэ некалькі будуць імкнуцца сабраць. А значная частка дыскваліфікуе сябе яшчэ да пачатку.

Напэўна, зноў будзе ў выбарчых спісах пастаянны спарынг-партнёр Лукашэнкі на выбарах, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргей Гайдукевіч. Будзе вылучацца і эканаміст Віктар Цярэшчанка. Ён ужо спрабаваў удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах 1994 і 2001, але не змог сабраць подпісаў. Але гэта, хутчэй, тэхнічныя кандыдаты. Якія не ставяць сабе за мэту перамогу на выбарах.

Рыхтуецца да выбараў і Аляксандр Лукашэнка, які апошнія тыдні актыўна наведвае рэгіёны краіны.

Што тычыцца даты выбараў, то 7 верасня, як папярэдне чакалася, іх не прызначылі. Палата прадстаўнікоў разглядала іншыя пытанні. Наступнае пазачарговае пасяджэнне прызначанае на 14 верасня.

Такім чынам, выбары могуць быць прызначаныя яшчэ на 19 снежня.

**Зміцер Панкавец**




**Намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валер Варанецкі ўшанаваў памяць рэпрэсаваных у Курапатах. Гэта адбылося падчас мотапрабегу «Катынскі шлях», які ладзілі 127 байкераў-палякаў. Кіруючыся ў Катынь праз Беларусь, яны наведалі Курапаты і Хатынь.**

# Анархістаў падазраюць у падпале расійскага пасольства

### Пяцёра юнакоў пад арыштам на Акрэсціна: ім не выстаўляюць абвінавачання, але і не адпускаюць.

3 верасня а шостай раніцы супрацоўнікі праваахоўных органаў у цывільным уварваліся ў кватэру, якую здымалі ў Мінску сябры анархісцкай групоўкі. Былі затрыманыя Ігар Багачак, Мікалай Дзядок, Аляксей Жынгероўскі, Сяргей Слюсар, Аляксандр Францкевіч і Валерыя Хоціна. З кватэры канфіскавалі пяць кампутараў, два ноўтбукі, мабільныя тэлефоны, часопісы ды грошы.

Маладыя людзі дагэтуль знаходзяцца пад арыштам у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў на вуліцы Акрэсціна ў Мінску. Прыхільнікаў анархісцкіх ідэяў апытваюць пра інцыдэнт ля пасольства Расіі ўвечары 30 жніўня. Пакуль абвінавачванне ім не выстаўлена. Тэрмін утрымання працягнулі яшчэ на трое сутак.

У панядзелак па той жа справе затрымалі Таццяну Семянішчаву, але пасля допыту яе адпусцілі, паведамляюць у паштовай рассылцы сябры затрыманых. Аналагічныя гісторыі адбыліся з іншымі людзьмі.

Следства высвятляе, ці датычныя анархісты да хуліганскіх дзеянняў, а таксама разглядае іншыя версіі, паведамляе ГУУС.

2 верасня ў СМІ з'явілася інфармацыя, што адказнасць за атаку на амбасаду ўзялі на сябе ці то расійскія, ці то беларускія анархісты. Ліст суполкі «Сябры свабоды» з'явіўся на сайце belarus.indymedia.org. Паведамлялася, што атака на пасольства Расіі ў Мінску ладзілася ў знак салідарнасці з абаронцамі хімкінскага лесу блізу Масквы.

Сайт не мае рэдакцыйнай групы — туды можа пісаць кожны, хто захоча. Аднак заявы «Сяброў свабоды» з партала выдалілі мадэратары, інфармацыю палічылі несапраўднай і небяспечнай для існавання сайта.

Як зазначаюць актывісты анархісцкіх рухаў, пра аўтаномную суполку «Сяброў свабоды» раней нічога не было вядома, яе існаванне выглядае сумнеўным.

«Магчыма, значную ролю адыгрываюць прыкметы разварушвання передвыбарчай сітуацыі паводле сцэнара, які мы ўжо назіралі напярэдадні выбараў 2006 года», — лічыць анархіст з Мінска.

Нагадаем, 30 жніўня ў 22.20 невядомыя закінулі дзве бутэлькі з гаручай сумессю на тэрыторыю расійскай амбасады. Загарэўся службовы аўтамабіль. Кіраўнік Беларусі, каментуючы здарэнне, намякнуў, што ў падпале могуць быць замешаныя расійскія спецслужбы. Па факце была распачатая крымінальная справа па артыкуле «Хуліганства», 6 верасня справу перакваліфікавалі на «Падпал». Максімальнае пакаранне за яго, прадугледжанае Крымінальным кодэксам, — да васьмі гадоў пазбаўлення волі.

У панядзелак вечарам у інтэрнэце з'явілася відэа са спасылкаю на тую ж анархісцкую суполку «Сябры свабоды», на якім двое невядомых закідваюць дзверы ізалятара на завулку Акрэсціна бутэлькамі з запальнай сумессю ў знак салідарнасці са зняволенымі. Па інцыдэнце заведзена крымінальная справа за «Злоснае хуліганства».

Сябры затрыманых лічаць, што гэтая акцыя — «правакацыя спецслужбаў у мэтах рэпрэсіяў людзей з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй».

Падрабязнасцяў пра спробу падпаліць Акрэсціна і затрыманні ўдзельнікаў нефармальных суполак міліцыя не дае. «Вядзецца следства, журналісцкае ўмяшанне тут можа зашкодзіць», — адзначыў Канстанцін Шалькевіч, намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі МУС.

**Юльян Місюкевіч**

Каментар да тэмы — гісторыя і сутнасць цяперашняга анархісцкага руху — **старонка 10**.

## Сцісла

• **Пасольства Расіі накіравала ноту пратэсту супраць выказванняў БТ і «Советской Белоруссіі».** Падставай для ноты сталі матэрыялы інфармацыйна-аналітычнай праграмы «Панарама» і газеты адміністрацыі прэзідэнта. У гэтых СМІ з'явіліся паведамленні аб тым, што адказнасць за інцыдэнт, калі двое невядомых закідалі тэрыторыю расейскай амбасады ў Мінску бутэлькамі з запальнай сумессю, узяла на сябе нейкая група расейскіх анархістаў.

• **Лукашэнка: Я не забараняю міністрам ісці ў прэзідэнты.** «Я не збіраюся паддобрывацца ні да ўрада, ні да сілавых структур», — заявіў Аляксандр Лукашэнка 1 верасня пасля наведвання аднаго з дамоў у дзіцячай вёсцы Вытокі. «Што да гэтага прэзідэнцтва, калі ласка, — любы грамадзянін Беларусі, член урада, ідзіце, збірайце подпісы і балатуйцеся. Ніхто нікому не забараняе. Гэта той час, калі гэта можна рабіць адкрыта».

• **Саюз фотажурналістаў Эстоніі: частка фатаграфій дыпламата Лахтэйна — падробка.** Журналісты пры дапамозе экспертаў па камп'ютарнай праграме апрацоўкі фатаграфій Adobe Photoshop знайшлі відавочныя прыкметы падробкі толькі ў трох скандальных фотаздымках. Астатнія прызнаныя сапраўднымі.

• **Падала ў адстаўку пасол Кыргызстана ў Беларусі Ішэнкуль Балджурава.** Рашэнне пакінуць пасаду яна прыняла па ўласным жаданні і падала заяву асабіста кіраўніку краіны Розе Атунбаевай.

**ЗП**

# Няма ніводнага прадукта, які б патаннеў за год

«Наша Ніва» параўнала цяперашнія цэны ў звычайнай мінскай прадуктовай краме з леташнімі. Паводле афіцыйных падлікаў Белстата, цэны на харчаванне за год падняліся на 7%

**Цэны ва ўніверсаме «Цэнтральны» Мінска (у рублях)**

| | хлеб «Барадзінскі» | малако (1 л) | батон (0,4 кг) | яйкі (10 штук) | вараная каўбаса (1 кг) | сыр (1 кг) | масла (200 г) | смятана 20%, 0,5л | грэчка (800 г) | макароны(800г) | курынае філе (1кг) | цукар (1 кг) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2009 | 1500 | 1560 | 1400 | 3000 | 12100 | 12000 | 2100 | 2000 | 2200 | 2500 | 13000 | 2080 |
| 2010 | 1600 | 1700 | 1700 | 3950 | 13400 | 15000 | 3100 | 3500 | 3900 | 2700 | 14200 | 2720 |
| РОСТ ЦАНЫ | 7% | 9% | 21% | 31% | 10% | 12% | 47% | 75% | 77% | 8% | 9% | 31% |

**Сусветныя цэны на мяса ўзняліся да рэкорду.** За апошнія 20 гадоў мяса яшчэ не каштавала гэтак дорага. Цэны на яго ў жніўні на 16% перавысілі леташні ўзровень. Рост выкліканы павелічэннем попыту на мяса ў краінах, што развіваюцца, і паніжэннем яго вытворчасці ў дзяржавах–экспарцёрах.

**Пошта і тэлефон падаражэлі.** З 1 верасня Міністэрства эканомікі змяніла тарыфы. Цэны на паштовую сувязь павышаны ў сярэднім на 10%, на паслугі электрасувязі — на 7,1%. Абаненцкая плата за карыстанне тэлефонам павялічыцца на 500—600 рублёў. Падаражэе нават радыёкропка — з 600 да 800 рублёў.

**Міністэрства сельскай гаспадаркі хоча падняць адпускныя цэны на малако на 10%.** Чыноўнікі спасылаюцца на рост сусветных цэн. Міністэрства эканомікі згадзілася на рост 2% у гэтым месяцы.

**Яўген Васількоў**

## Заробкі дактароў і настаўнікаў паднялі на чвэрць

Перадвыбарны рост тарыфнай стаўкі будзе каштаваць бюджэту $2,2 млрд.

Паводле пастановы ўрада, з 1 верасня стаўкі педработнікаў, а таксама аклады дактароў падвышаныя на 25%.

На 15% павышаюцца аклады работнікаў установаў сацыяльнага абслугоўвання і работнікаў культурна-асветніцкіх установаў.

Маладыя спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія працуюць па размеркаванні, таксама атрымаюць прыбаўку, але меншую — 10%.

Пастаянная прадстаўніца Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусі Наталля Калядзіна марна нагадвае, што ў краіне адсутнічаюць аб'ектыўныя перадумовы да росту зарплаты. «У дадзеных умовах я не бачу эканамічных падставаў для яе павелічэння», — заявіла яна.

Павелічэнне заробкаў бюджэтнікаў патрэбнае прэм'ер-міністру Беларусі Сяргею Сідорскаму, каб выканаць жорсткае патрабаванне кіраўніка дзяржавы. Лукашэнка хоча дасягнуць да канца года сярэдняй зарплаты ў бюджэтнай сферы ў памеры $410.

Каб хапіла грошай, урад прапануе Лукашэнку пагадзіцца з падвышэннем дэфіцыту бюджэту ў гэтым годзе — з 1,5% ВУП да 3% ВУП. Для забяспечэння запланаванага падвышэння зарплаты ў бюджэтнай сферы дадаткова спатрэбіцца $2,2 мільярда.

**ЯВ**

## Чарговы абвал золатавалютных рэзерваў

Жнівеньскія звесткі шакуюць.

Так, за жнівень валютныя запасы выраслі на 237,4 млн даляраў. Але ўлічвайце, што ў жніўні Беларусь атрымала $1 млрд ад размяшчэння еўрабондаў. А гэтыя грошы неўзабаве прыйдзецца аддаваць. Калі б не гэтыя аблігацыі, рэзервы ўпалі б на рэкордную суму 762 млн за месяц.

Калі летась па нацыянальным запасе біла падзенне экспарту ў выніку сусветнага крызісу, дык сёлета грошы разыходзяцца найперш на перадвыбарны рост заробкаў.

Такі дэфіцыт бягучага рахунку вымусіць урад або прыватызаваць яшчэ адно вялікае прадпрыемства, або пазычыць больш грошай на міжнародным рынку.

**Сяргей Гезгала**

## Лібералізацыя: рознічным гандлем можна будзе займацца без ліцэнзіі

Аднак скарачэнне «ліцэнзійнага спіса» не закранула выдавецкай і юрыдычнай дзейнасці.

У Беларусі з 1 студзеня 2011 года будзе скарочаны пералік відаў дзейнасці, што патрабуюць ліцэнзавання. Гэта прадугледжана прэзідэнцкім указам № 450, падпісаным 1 верасня. Больш не трэба афармляць спецыяльныя дакументы, каб займацца 16-цю відамі дзейнасці. Нагадаем, што кошт кожнай аднагадовай ліцэнзіі складаў 100 еўра.

З пераліку ліцэнзаванай дзейнасці выключаны самыя масавыя віды дзейнасці – гандаль і грамадскае харчаванне, на долю якіх прыпадала больш як 50% ліцэнзій. Сярод іншых – некаторыя будаўнічыя паслугі, турыстычная дзейнасць, транспартна-экспедыцыйная дзейнасць, прыцягненне ў Беларусь замежнай працоўнай сілы, перапрацоўка рыбы.

Ліцэнзіі застаюцца неабходнымі для 60 работ і паслуг, рэгуляванне якіх ускладзена на міністэрствы і іншыя дзяржаўныя ўстановы.

Напрыклад, дзейнасцю, звязанай з аздараўленнем дзяцей за мяжой, паранейшаму курыруе Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, а працаўладкаваннем беларусаў за мяжой – Міністэрства ўнутраных спраў.

**ЯВ**

## Расіі адмовілі ў беларускай грэчцы

Расіяне скардзяцца на ўзроўні прэзідэнта.

Маскоўскія сеткавыя рытэйлеры заявілі, што іх беларускія пастаўшчыкі, у якіх ёсць грэчка, адмаўляюцца пастаўляць яе праз абмежаванні, устаноўленыя ўрадам Беларусі.

У сувязі з гэтым прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што «гэта не прававыя, гэта медыцынскія абмежаванні», і папрасіў першага віцэ-прэм'ера Ігара Шувалава, які курыруе Мытны саюз, «пагаварыць з калегамі». «Я разумею, што справа гэта цяжкая, часам патрабуе вялікіх душэўных сілаў. Але куды дзявацца, мы ў адным саюзе, мы брацкія дзяржавы», — сказаў Мядзведзеў.

У сваю чаргу намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Васіль Седзін растлумачыў, што краіна пакуль не мае лішкаў грэцкіх круп для экспарту. «Нам трэба перш за ўсё забяспечыць свае патрэбы», — растлумачыў Седзін.

У канцы жніўня расійскія СМІ паведамілі, што грэцкія крупы рэзка падаражэлі і зніклі з продажу ў многіх сеткавых крамах. Па дадзеных Расстата, грэчка з пачатку года вырасла ў цане на 85%.

**ЯВ**

## У 2011 годзе даляр будзе каштаваць 3170 рублёў

Такая лічба закладзеная ў праекце бюджэту.

Міністр фінансаў Андрэй Харкавец, прадстаўляючы ў палаце прадстаўнікоў праект бюджэту на 2011 год, адзначыў, што ў наступным годзе ўзрастае нагрузка на аплату замежнага дзяржаўнага доўгу. Давядзецца выплаціць $695 млн па пазыках міжнародных фінансавых арганізацыяў, а таксама Расіі, Кітая, Венесуэлы. Разам з тым, планацца ў 2011 годзе ўзяць у якасці пазыкі яшчэ $2,2 мільярда.

**ЯВ**

### Сцісла

• **Лукашэнка загаварыў пра прыватызацыю зямлі.** Кіраўнік дзяржавы прапанаваў аддаць землі калгасаў прыватнікам для развіцця фермерскіх гаспадарак. «Няхай робяць на іх, што хочуць, толькі вырабляй і прадавай прадукцыю: вось табе возера, вось табе 100 га», — сказаў Лукашэнка.

• **Польшча сабралася раскулачыць «Газпром».** Улады краіны маюць намер адабраць у расійскай кампаніі газапровод «Ямал-Еўропа». Згодна з еўрапейскім заканадаўствам, газапровод павінен кіравацца незалежным органам і быць даступным трэцім бакам. Варшава хоча перадаць мясцовы ўчастак газапровода пад кантроль дзяржаўнай Gaz-System. «Газпром» з уласнасцю расставацца не жадае, але гатовы прыняць паслугі Gaz-System як тэхнічнага аператара.

• **Кітай пабудуе 30 км чыгункі пад Кіевам за $1 мільярд.** Ветка злучыць украінскую сталіцу і міжнародны аэрапорт «Бaрыспаль». Кітай з гатоўнасцю ўступае ў мадэрнізацыйныя праекты ў постсавецкіх краінах.

• **Фермеры ў Эквадоры заняліся вырошчваннем ядомых руж.** Кветкі вырошчваюць у экалагічна чыстых горных раёнах, без ужывання пестыцыдаў і хімічных угнаенняў. Салаты і дэсерты з пялёсткамі цяпер модныя ў рэстаранах Нью-Ёрка і Барселоны. Па словах наведвальнікаў, смак незвычайны, але вельмі прыемны.

• **Латвійцы будуць друкаваць этыкеткі і кветкі ў Беларусі.** Паліграфічнае прадпрыемства Liepajas papirs вырашыла частку вытворчасці перанесці ў Гомель. Плануецца перавезці абсталяванне і навучыць працаўнікоў, каб у будучым годзе пачаць выпуск прадукцыі. Летась прыбытак кампаніі склаў $400 тысяч.

**ЯВ**

# Сям’я Латыпавых

Не так даўно ў беларускіх СМІ прайшла інфармацыя, што былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Урал Латыпаў набыў сваім дзецям Алене і Кіму кватэры ў Маскве, агульны кошт якіх склаў амаль мільён даляраў.

### Урал Рамдракавіч

Ураджэнца Башкірыі Урала Рамдракавіча Латыпава ў Мінск упершыню занесла ямчэ ў 1974 годзе на вышэйшыя курсы КДБ СССР. Пачыналася кар’ера Латыпава якраз са спецслужбаў. Да 1989 года ён служыў у органах КДБ на самых розных пасадах. Потым стаў намеснікам начальніка Інстытута нацыянальнай бяспекі.

З Лукашэнкам Латыпаў ад першага года. У 1994-м Урал працуе памочнікам прэзідэнта. На гэтай даверальнай пасадзе ён прасядзеў чатыры гады, пакуль не замяніў Івана Антановіча на пасадзе міністра замежных справаў. У 2000 годзе на тры месяцы давялося яму ўзначаліць і Раду бяспекі.

Апошняй жа пасадай у Беларусі для Латыпава было кіраўніцтва Адміністрацыяй прэзідэнта. Неўзабаве пасля рэферэндуму аб трэцім тэрміне Латыпаў сышоў у адстаўку.

«Ні ў дзяржаўных органах, ні ў КДБ я працаваць больш не буду. Гэта перагорнутая старонка», — падзяліўся тады Латыпаў у інтэрв’ю «Народнай волі».

Латыпаў заўсёды меў рэнамэ інтэлектуала, і свой розум ён умела выкарыстоўваў для замацавання ўлады Лукашэнкі. Цікава, што да апошняга ён ездзіў не на дарагой машыне, а на сціплай бардовай «сямёрцы».

Кіраўнік дзяржавы, здаецца, таксама ставіўся да свайго падначаленага з вялікай павагай, што ёсць, у прынцыпе, рэдкасцю. Латыпаў з’ехаў у Маскву, тры гады адпрацаваў старшынёй кансультацыйнае рады кампаніі «Лукойл-Беларусь». Летась Латыпаў узначаліў кампанію «Дырэкт-Менеджмент», якая ўваходзіць у буйны маскоўскі дэвелаперскабудаўнічы холдынг «Рубін».

Кампанія знаходзіцца ў ліку лідараў расійскага рынку забудовы і эксплуатацыі гандлёвых і офісных памяшканняў. Сярод уладальнікаў холдынга Урал Латыпаў не значыцца.







PHOTO.BYMEDIA.NET

### Не Урал, а самі дзеці

Пасля публікацыі навіны пра набыццё Латыпавым нерухомасці ў рэдакцыю пазваніла жанчына, якая прадставілася знаёмай сям’і Латыпава. Найперш яна сказала, што кватэры набываў не Урал Рамдракавіч, а самі дзеці, якія працуюць на добрых пасадах.

Што датычыць Кіма Латыпава, то, па яе словах, ён ажаніўся з дзяўчынай з-пад Слуцка. Часта прыязджае ў Беларусь да сваякоў жонкі. «Бульбу прыязджае капаць. Мову нашу шануюць», — казала жанчына.

У самога Урала жонка таксама беларуска. Ён і сёння часта наведвае Мінск.

Мы вырашылі высветліць, кім жа працуюць дзеці Латыпава. Знайсці такую інфармацыю аказалася нескладана.

### Кім

Сын былога кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Кім Латыпаў працуе ў буйной брытанскай юрыдычнай кампаніі Linklaters.

Кім спачатку скончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. А потым у 2002-м атрымаў ступень магістра ў сусветна вядомым Оксфардскім універсітэце (Вялікабрытанія). Ён вывучаў еўрапейскае і параўнальнае права.

Яшчэ за час вучобы ў Расіі ён праходзіў практыку ў розных юрыдычных канторах. Першай жа сур’ёзнай стала праца юрыста ў кампаніі Global One.

Адразу па сканчэнні Оксфарда 26-гадовы Латыпаў уладкоўваецца ў маскоўскі офіс Linklaters. Юрысты гэтай кампаніі аказваюць падтрымку пры падпісанні самых розных здзелак. Працадаўца Кіма Латыпава займае другое месца па даходах сярод падобных брытанскіх фірмаў.

Дарэчы, па звестках мінулага года Linklaters плаціла сваім новапрынятым супрацоўнікам 61,5 тысячы фунтаў стэрлінгаў у год (прыкладна 51 тысяча еўра).

Праз два гады працы Латыпаў становіцца ўжо вядучым супрацоўнікам прадпрыемства. У 2007—2008 гадах ён працуе ў галоўным лонданскім офісе, а потым зноў вяртаецца ў Маскву. Ад мінулага года Латыпаў значыцца на сайце Linklaters як партнёр кампаніі ў Маскве.

Пры ўдзеле Кіма Латыпава прымаліся досыць значныя здзелкі. Напрыклад, падчас зліцця буйных алюмініевых кампаній свету РУСАЛа і СУАЛа, ці калі швейцарцы з Glencore набывалі працэнт у «Руснафты», альбо пры здзелках найбуйнейшага вытворцы медзі з Казахстана «Казахмыса».

Такім чынам, Латыпаў заслужыў сваёй працай добрую рэпутацыю.

### Алена

Алена Уралаўна Латыпава на сёння з’яўляецца старшым выкладчыкам кафедры адміністратыўнага і фінансавага права Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных зносін.

Вучылася яна ў гэтай жа ВНУ, атрымала, як і брат, чырвоны дыплом. У 2004-м паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Забеспячэнне выканання абавязку па выплаце падаткаў і збораў: фінансаваправавы аспект».

Чытае лекцыйныя курсы «Фінансавае права Расіі», «Міжнароднае фінансавае права», «Бюджэтнае права Расіі і замежных краін», спецкурс «Механізм выканання абавязку па выплаце падаткаў і збораў».

На папулярным расійскім кніжным сайце ozon.ru прапануецца чытачам 128-старонкавая манаграфія Алены Латыпавай, прысвечаная праблеме выплаты падаткаў.

Такім чынам, можна меркаваць, што дзеці Латыпава сапраўды досыць паспяховыя і забяспечаныя людзі.

Але ні сам Латыпаў, ні ягоныя дзеці не звязалі свайго лёсу з Беларуссю. Дарэчы, няма другой такой краіны, топ-чыноўнікі якой выязджалі б пасля адставак на працу ў былую метраполію так масава.

### Як у іншых?

Вядома, што дзеці Аляксандра Лукашэнкі скончылі факультэт міжнародных адносінаў БДУ. Цяпер яны займаюць высокія пасады ў краіне. Віктар — дарадца кіраўніка краіны па бяспецы, Дзмітры ўзначальвае «Прэзідэнцкі спартыўны клуб».

Сын Уладзіміра Навумава Захар цяпер працаўладкаваны ў службе пратакола Міністэрства замежных справаў. У сферы дыпламатыі задзейнічаны сын кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея Віталь.

Прадстаўнік Беларусі пры Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы ў Страсбургу Андрэй Сухарэнка — сын былога старшыні КДБ Сцяпана.

**Зміцер Панкавец**



ONLINER.BY

# Яшчэ адна аварыя з удзелам машыны з картэжу Лукашэнкі?

**1 верасня ў Мінску сутыкнуліся легкавік Citroen Xantia і джып Lexus з мігалкамі, падобны да аўто суправаджэння кіраўніка краіны.**

У інтэрнэце на аўтафорумах з’явіліся фотаздымкі ДТЗ на вуліцы Гарэцкага ў Мінску. На фота — легкавік Citroen Xantia з пашкоджаным перадам і джып Lexus з мігалкамі, падобны да аўто з картэжу Лукашэнкі. Паводле аўтара здымкаў, аварыя здарылася прыблізна а 8-й раніцы насупраць выезду з двара дома №41. Іншых падрабязнасцяў наведнік форуму не паведаміў.

Ва Упраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама паведамілі, што дадзенае дарожна-транспартнае здарэнне імі не фіксавалася. «Праз упраўленне праходзяць толькі ДТЗ з пацярпелымі. Калі іх няма, то такія справы разглядаюцца і фіксуюцца па месцы здарэння», — патлумачыў дзяжурны.

У Фрунзенскім РУУС пацвердзілі факт здарэння. Пры гэтым дадалі, што акалічнасці аварыі стануць вядомыя не раней, чым праз месяц, бо для іх высвятлення прызначаная экспертыза. Кім былі ўдзельнікі аварыі, і хто з іх вінаваты ў здарэнні, стане вядома па сканчэнні экспертызы.

Адна з апошніх аварый з удзелам аўто з картэжу кіраўніка краіны, пра якую стала вядома прэсе, здарылася 6 чэрвеня 2006 г. На скрыжаванні вуліцаў Першамайскай і Чырвонаармейскай чорны мікрааўтобус з танаваным шклом з картэжу сутыкнуўся з легкавіком «пежо». Пацярпеў кіроўца легкавіка. Ва Упраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама тады заявілі, што здарэння ў тым месцы не фіксавалася.

**Сямён Печанко**

# Пакарэнне Парыжа

**Сенсацыйная перамога над французамі адкрыла перад футбалістамі Беларусі ўнікальны шанец.**



**Аляксандр і Вячаслаў Глебы, Антон Пуціла, Сяргей Крывец, Ян Цігараў (злева направа) дзякуюць беларускім заўзятарам на «Стад дэ Франс» за падтрымку.**

Пачынаць адборачны цыкл да чэмпіянату Еўропы па футболе-2012 беларусам выпала на славутым стадыёне «Стад дэ Франс». У парыжскім прадмесці Сэн-Дэні дванаццаць гадоў назад французы на чале з Зінэдзінам Зіданам сталі чэмпіёнамі свету.

Зрэшты, сённяшняя зборная зусім не падобная да той. Мундыяль у Паўднёвай Афрыцы для «трохкаляровых» скончыўся ганебна. Пройгрышы ад Мексікі і ПАР не далі французам нават магчымасці выйсці з групы.

Новым трэнерам французаў стаў Ларан Блан. У чэмпіёнскім 1998 годзе ён быў капітанам Францыі. Аднак паставіць з ходу гульню сваім хлопцам славуты ў мінулым футбаліст не змог. У жніўні яны прайгралі Нарвегіі.

Гульня з беларусамі разглядалася французамі як спроба пачаць новую светлую паласу ў гісторыі зборнай. Нягледзячы на няўдачы, «Стад дэ Франс» быў запоўнены практычна цалкам. Амаль кожны заўзятар трымаў у руках нацыянальнае палотнішча. Нават прэзідэнт Францыі Нікаля Саркозі наведаў гульню. Трыста беларускіх фанатаў (у іх было багата бел-чырвона-белых сцягоў) патаналі ў гэтым моры.

Сам матч паказаў, што французы не вылечылі сваіх старых балячак. Яны так і не навучыліся забіваць і не прадэманстравалі волі да перамогі. Але ж гэта не нашы праблемы. За ўсю сустрэчу ля брамы Юрыя Жаўнова быў створаны адзін сапраўды небяспечны момант, і той на апошній секундзе гульні.

Не сказаць, што нашым хлопцам шмат што ўдавалася ў атацы, але яны, прынамсі, выглядалі адзіным дзейсным механізмам, а не кучкай капрызных зорак, як супернікі.

Каманда Бернда Штанге настойліва чакала свайго моманту ля чужых варот і дачакалася яго за пяць хвілін да сканчэння асноўнага часу. Вячаслаў Глеб прапараніў палову абароны гаспадароў, выйшаў у штрафную, адкуль выдатна прастрэліў на ход Сяргею Кісляку. Удар у мінскага «дынамаўца» атрымаўся на зайздрасць прыгожы — 1:0.

Сумненняў, што беларусы не прайграюць, не было ўжо ў тыя моманты, калі Аляксандр Глеб пачаў адпрацоўваць у абароне, — такога не было амаль ніколі. Пасля ж гола стала зразумела: з Парыжа, мы вязём перамогу.

Бернд Штанге ж заклікае не ўпадаць у эйфарыю ад поспехаў, бо наперадзе яшчэ шмат адказных гульняў.

**Зміцер Панкавец**

## Здарэнні сцісла

• **«БМВ» ушчэнт, двое насмерць.** 5 верасня раніцай каля вёскі Свіслач (Гродзенскі раён) кіроўца BMW вылецеў у кювет, перакуліўся і ўрэзаўся ў дрэва. За рулём ехаў 22-гадовы хлопец. На закругленні дарогі, вылучаным знакам «Небяспечны паварот», ён няправільна выбраў хуткасць. Машыну вынесла, а ў кювеце яна стукнулася ў плот хаты і дрэва. Кіроўца і 19-гадовы пасажыр памерлі на месцы. Яшчэ адзін юнак трапіў у бальніцу. У ДАІ падкрэсліваюць: вінаваты не меў пасведчання кіроўцы, яго 6 разоў затрымлівалі як асобу, што не мае права кіравання, і 5 разоў — за кіраванне п'яным. А 4 лютага 2007 для яго спынення нават прыйшлося выкарыстаць зброю. Толькі пасля таго як у «Масквічы» прастрэлілі заднія колы, машына спынілася.

• **У трох гандляроў на «Ждановічах» сканфіскавалі 150 DVD з парнаграфіяй.** 2 верасня супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама затрымалі на «Полі цудаў» — барахолцы, пра якую пісала «НН» у №28 — трох маладых людзей. Для акрэслення зместу дыскаў прызначана мастацтвазнаўчая экспертыза. У выпадку, калі яна пацвердзіць вывады аператыўнікаў, у дачыненні да затрыманых распачнуць крымінальныя справы за выраб і распаўсюд парнаграфіі (арт. 343 КК). Усяго ад пачатку года ў сталіцы сканфіскавалі прыкладна 1500 парнадыскаў. А ў маі ліквідавалі цэлую студыю, што тыражавала іх. 15 чалавек прыцягнулі да крымінальнай адказнасці.

• **Грамадзяніна Беларусі падазраюць у збіцці масквічкі да смерці.** Пра тое паведаміла маскоўская міліцыя. Цела 24-гадовай знайшлі ў пачатку жніўня ў кватэры на Петразаводскай вуліцы расейскай сталіцы. «Затрымалі грамадзяніна Беларусі, які выкрыты ў тым, што ў перыяд з 23 ліпеня па 4 жніўня па месцы часовага пражывання перыядычна збіваў пацярпелую, ад чаго яна потым памерла», — сказаў суразмоўца расійскага агенцтва. Нагадаем, што тыдзень таму нарабіла шуму гісторыя, як былыя маскоўскія міліцыянты згвалцілі беларуску.

**auto.onliner.by, БелаПАН**



# Каложу адновяць з дапамогай газасілікатных блокаў

**З верасня ў Гродне стартавала грамадская акцыя «Адновім Каложу разам!»**

Хоць акцыя і называецца «грамадскай», ініцыяваў яе выканкам.

Кампаніі папярэднічала маштабнае апытанне грамадскай думкі па тэлефонах гарачай лініі і на вуліцах. За тры дні сябры гродзенскага БРСМ апыталі 2019 чалавек, з якіх 85,7% выказаліся за «аднаўленне царквы».

Аднак што маецца на ўвазе пад аднаўленнем?

Гісторыкі непакояцца, што ў часе рэканструкцыі старажытнай Барысаглебскай царквы, якую называюць яшчэ Каложай, будуць выкарыстоўвацца сучасныя будматэрыялы, як гэта робіцца ў Нясвіжы ды Міры. Загадчыца кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Святлана Марозава ўхваліла імкненне ўладаў раіцца з народам. Аднак, калі гаворка ідзе пра такія важныя пытанні, як будучыня Каложы, мяркуе яна, апошняе слова мусіць быць за спецыялістамі.

Як выявілася, перасцярогі гродзенскіх гісторыкаў не былі марнымі. У пачатку верасня на мясцовым тэлеканале прагучала інфармацыя, што страчаны пры абвале грунту мур выбудуюць з газасілікатных блокаў.

Між тым, згодна з размешчанымі на сайце аблвыканкама эскізамі архітэктурнага праекта аднаўлення царквы, страчаную сцяну мусілі аднаўляць з керамічнай цэглы-плінфы і апрацаваных валуноў — як і будавалі калісьці.

Цяпер палічылі, што драўляную сцяну танней замяніць сцяной з пенаблокаў, схаваных пад плінфай.

Дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ Армен Сардараў кажа, што яшчэ два гады таму выказваўся супраць выкарыстання сучасных будаўнічых матэрыялаў пры аднаўленні Каложы. «Калі мы аднаўляем унікальныя помнікі з выкарыстаннем жалезабетону і газасілікату, то прыўносім у іх элемент несапраўднасці. А тым больш, калі гаворка пра такі аб'ект, як царква XII ст.» Архітэктар трымаецца меркавання, што ў выпадках з разбуранымі або часткова парушанымі помнікамі, як Каложа, лепш пакінуць усё як ёсць, папярэдне грунтоўна законсерваваўшы.

Гродзенская епархія праваслаўнай царквы мяркуе, што храм трэба аднавіць у выглядзе, максімальна набліжаным да першапачатковага, г.зн. у старажытнарускім стылі з архітэктурнымі дэталямі, уласцівымі праваслаўным храмам візантыйскага тыпу. Гэта значыць, храм можа набыць над сабой купал.

**Сямён Печанко**



PROSTO_FREE.LIVEJOURNAL.COM



# На былым клецкім касцёле з'явіліся яшчэ дзве «цыбуліны»

**Святара не спынілі лісты з Міністэрства культуры.**

На былым клецкім касцёле з'явіліся яшчэ дзве «цыбуліны». Яны паўсталі на вежах над уваходам. Так скончылася праца над «аздабленнем» даху бажніцы, пачатая настаяцелем прыходу ў кастрычніку 2008-га. Тады ініцыятыва святара выклікала скандал. Старшыня Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч звяртаўся ў Міністэрства культуры і пракуратуру. З Міністэрства культуры тады адказалі, што ўсталяванне купалаў-цыбулін на былым касцёле парушае заканадаўства, бо ён з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю 1-й катэгорыі і такія дзеянні прывядуць да змены выгляду помніка. Клецкі райвыканкам атрымаў папярэджанне з вобласці. У пракуратуру неаднаразова звяртаўся і мясцовы актывіст Сяргей Панамароў. Аднак, а. Матфей Белавус зрабіў па-свойму. Як бачым, на адной «цыбуліне» бацюшка не спыніўся.

**СП**

# Сырок разладу

**Вучняў са шматдзетных сем'яў у школах кормяць інакш, чым астатніх.**

Школьнае харчаванне — платнае. Дзяржава падтрымлівае толькі льготнікаў, сярод якіх і вучні са шматдзетных сям'яў. Але для дзяцей такая падтрымка часам ператвараецца ў псіхалагічны ціск.

Маці адной мінскай шматдзетнай сям'і Таццяна расказала, што ежа для яе дзяцей адрозніваецца ад рацыёну школьнікаў, чые бацькі самі плацяць. Адрозненні нязначныя, але і яны, здараецца, могуць выклікаць непрыязныя адносіны ў коле школьнікаў.

«Дзеці самі сябе падзяляюць на «платнікаў» і «бясплатнікаў». Я не кажу, што ежа горшая. Але «платнікам», напрыклад, дадуць глазураваны сырок, астатнім — не. Дзеці адчуваюць сябе ў іншым становішчы».

Для старэйшай дачкі Змітра, бацькі траіх дзяцей з Мінска, такі падзел першае школьнае паўгоддзе быў псіхалагічнымі пакутамі. Ён нават думаў адмовіцца ад бясплатнага харчавання. Але дзяўчынка ў выніку перастала рэагаваць на адрозненні.

У аддзеле ідэалагічнай і выхаваўчай працы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама патлумачылі, што вучні, за якіх плацяць бацькі, самі выбіраюць, што і колькі ім есці. А для бюджэтнікаў дзяржава вызначыла стандарт на бясплатнае харчаванне. Але «ніхто не перашкаджае дадаткова за свае грошы дакупляць ім ежу».

Яшчэ адным фактарам падзелу школьнікаў стала пасадка дзяцей падчас сілкавання. Для дзяцей, якія абедаюць бясплатна, накрываюць асобныя сталы. Не ўсюды. Ці рабіць гэта, вырашае адміністрацыя кожнай школы самастойна. У камітэце па адукацыі Мінгарвыканкама не лічаць, што гэта праблема. Там упэўнены, што асобнае харчаванне выключае магчымасць дзяцей параўноўваць свае рацыёны. А разам з тым і знікае зайздрасць, калі ў аднаго дзіцяці ёсць банан, а ў іншага яго няма.

Псіхолаг Жанна Міцкевіч не бачыць глыбокага сацыяльнага падзелу паміж вучнямі ў дадзенай сітуацыі. «Дзяцей найперш цікавіць тое, хто ў што адзеты і г.д. У выпадку з ежай дзіця можа задумацца над тым, дзе ўзяць грошы, каб набыць тое, што яму хочацца з'есці. Нездарма дзеці, якія крадуць грошы ў бацькоў, часта трацяць іх адразу на чыпсы, жвачку».

**Кастусь Матушыч**

# Ліду да Дажынак будуюць нават в'етнамцы

**На ўсе нашы пытанні яны адказвалі завучанай фразай: «Не панемать па-рускі».**

Плітка на галоўнай плошчы выкладзена кругам у тры колеры: чырвоны, сіні, зялёны. Сцэна будзе размешчана ў цэнтры гэтага кола, а вакол, як зазсёды, будуць расстаўлены крэслы. Зрабіць пляцоўку рабочыя абяцалі да 8 верасня. Таму яны працавалі па 12 гадзін у дзень. Падоўжаныя былі змены і на ўсіх аб'ектах у Лідзе.

Андрэй Ганчар, дарожны рабочы з Ваўкавыска, кажа: «Павінны паспець! Як начальнік сказаў: «Прэстыж фірмы залежыць ад нас!» Насупраць нас райвыканкам, прыходзяць правяраць. Тут халтуры ўжо не бывае».

Побач з плошчай разбудоўваюць дарогу. Раней яна была на дзве паласы, зараз жа будзе на чатыры. Работа кіпіць поўным ходам, тут рабочыя працуюць нават у нядзелю.

Калі заглядваеш у двары, бачыш напалову адрамантаваныя дамы і побач з імі рыштаванні. Ці будуць іх дараблясць пасля Дажынак і калі гэта будзе – невядома. Пакуль усе сілы былі кінутыя на фасады цэнтральных вуліцах. Таму дамы на галоўную вуліцу ўсміхаюцца вясёлкавай навіной, а з двароў застаюцца шэрымі і панурымі.

Прывезлі ў Ліду нават брыгаду в'етнамцаў. На жаль, паразмаўляць з кімсьці з брыгады мы не змаглі, бо ніхто з рабочых не ведаў ні расейскай, ні беларускай мовы. На ўсе нашы пытанні яны адказвалі аднолькавай завучанай фразай: «Не панемать па-рускі».

Працай гэтай брыгады мясцовыя жыхары вельмі задаволены. Кажуць, яны вельмі добра робяць, працаўнікі.

Зараз перад рабочымі стаіць задача здаць галоўныя аб'екты, менш значныя плануюць дарабіць пазней. Напрыклад, памятны знак да двухтысячагоддзя хрысціянства канчаткова здадуць у лістападзе.



**Апошні раз такія маштабныя будоўлі ў Лідзе былі ў часы Гедыміна.**

«У асноўным да Дажынак будзе дабудаваны, толькі не паспеем зрабіць надпісы, гэта ўжо будзе да лістапада, — тлумачыць старшы прараб СУ-104. — Не паспяваем, бо было шмат няўвязак з праектам. Помнік будуецца за грошы спонсара з Масквы, толькі фундамент і калоны зроблены за грошы 19-га трэста. Спонсар сам нас знайшоў і выказаў жаданне пабудаваць гэтую стэлу, бо сам ён родам з Ліды. Каштуе гэты помнік 1 мільярд 380 мільёнаў».

Галоўным жа аб'ектам рэканструкцыі ў Лідзе стаў Лідскі замак.

Да галоўнага свята хлебаробаў засталося нядоўга. Яно пройдзе 18—19 верасня. Таму хутка не толькі лідчукі, але і госці, нарэшце, змогуць пабачаць Ліду пасля капітальнага рамонту.

**Ганна Навумовіч, Ліда**

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

# Бітва за часнок

**На Камароўскім рынку я вырашыў прадаць тры кілаграмы часнаку.** А от не! Тая самая зборшчыца падатку за гандлёвае месца сп.Красоўская, ад якой у мінулым годзе адкупляўся 500 рублёў за месца, запатрабавала ўжо 2600 рублёў за тое самае месца. Што ж змянілася за год? Пенсія вырасла на 9,5%, аплата за месца — у 5 разоў з хвосцікам.

Прыйшла чарга сказаць мне: «А от не!» Плюнуў 75-гадовы вясковец на рабаўніцу-Камароўку і сышоў з горыччу на сэрцы, так і не прадаўшы ніводнай галоўкі свайго зімовага.

**Мікола Яўмененка, Чудзенічы, Лагойскі раён**

# Страшная смерць Алега Бябеніна

Працяг з старонкі 1.

У суботу прагучала папярэдняя версія прычынаў смерці апазіцыйнага журналіста — самагубства.

Ад пачатку праверкай па факце смерці занялася пракуратура Дзяржынскага раёна, потым яе пераняла пракуратура Мінскай вобласці. Справа знаходзіцца на кантролі Генеральнай пракуратуры. Яе прэсслужба ў панядзелак, 6 верасня, пацвердзіла папярэднюю версію следства пра суіцыд.

Мінаблпракуратура, у сваю чаргу, заявіла, што пра страшную знаходку ў Пярхураве першымі даведаліся пабочныя асобы — маюцца на ўвазе, мусіць, калегі нябожчыка, якія і прыляцелі на лецішча хутчэй за міліцыю.

Прадстаўнікі следства заявілі таксама, што труп Бябеніна знайшла сястра ягонай жонкі. Таксама былі агучаныя сведчанні суседзяў журналіста па лецішчы. Тыя нібыта ні напярэдадні, ні ў дзень трагедыі, акрамя самога Алега, не бачылі ніякіх староннніх асоб побач з домам.



Дом, у якім знайшлі цела Алега Бябеніна.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Родныя і сябры Алега Бябеніна, у сваю чаргу, кажуць пра мноства нестыковак у справе. Найперш ні родныя, ні сябры не даюць веры, што чалавек з такім характарам мог пайсці на такі крок.

Усе ў адзін голас кажуць, што Алег проста абагаўляў свайго малодшага сына. Па іх словах, Алег з сям'ёй толькі тыдзень таму вярнуўся з адпачынку з Грэцыі, быў поўны планаў.

Паплечнікі Бябеніна пабывалі на месцы трагедыі ў той самы дзень. Яны называюць лухтой словы пра пляшкі з бальзамам, бо Алег ніколі такога не ўжываў. Ён быў снобам у сэнсе алкаголю, кажуць усе ў адзін голас, у тым ліку і журналісты «Нашай Нівы», якія яго ведалі. Дый увогуле, ён не выпіваў.

Дый на дачу напіваццa не едуць аўтамабілем. «Беларускі бальзам» не п'юць асобна, тым больш — мужчыны. «Беларускі бальзам» — гэта з шэрагу стэрэатыпаў пра беларуса. Кшталту «гарэлка-ікра-балалайка» ў дачыненні да расейцаў. Згадку пра «Беларускі бальзам» паспешліва растыражавалі афіцыйныя СМІ з падачы МУС, калі яшчэ не падавалі іншых дэталяў.

Ёсць прэтэнзіі і да нявызначанасці следства наконт часу смерці журналіста — 2 або 3 верасня, а гэта важна для разумення хады падзей. А галоўная заўвага — да паспешлівасці следчых, з якой яны агучылі папярэднюю версію пра самагубства. Пра некаторыя дэталі, якія не знайшлі адлюстравання ў пратаколах і экспертызах, родныя і сябры абяцаюць расказаць пасля агучвання афіцыйнай версіі следства.

**Мікола Бугай**

## «Ён нагамі стаяў на падлозе. Не вісеў, а ўпіраўся нагамі ў падлогу»

Калега загінулага журналіста, які пабываў у доме разам з міліцыянтамі, расказаў «Нашай Ніве», што ён пабачыў унутры лецішча.

— Ні крошкі ежы, ідэальная чысціня ў доме, дзве пустыя бутэлькі ад «Беларускага бальзаму» — ён бы яго пад расстрэлам не піў, будучы адным з найлепшых спецыялістаў па віскі ў краіне. Дый ён за рулём быў — які там алкаголь.

— Ён на машыне на лецішча прыехаў?

— Так, на машыне. І павінен быў у кіно ехаць. Яго чакалі ў кавярні, ён адправіў смс, што не паспявае ў кавярню, прыедзе проста ў кіно.

— Запісак, паперак сапраўды ніякіх не бачылі?

— Ніякіх запісак. Ён нагамі стаяў на падлозе. Не вісеў, а ўпіраўся нагамі ў падлогу. І была драпіна на руцэ.

Калега Бябеніна не захацеў называць свайго імя. Бо сябры дамовіліся не каментаваць фактаў публічна, пакуль улады не абвесцяць свайго вердыкту.

### РЭАКЦЫІ

• **Еўрапарламент патрабуе расследавання.** Прэзідэнт Еўрапарламента Ежы Бузэк выказаў занепакоенасць у сувязі з гібеллю заснавальніка сайта charter97.org: «Заклікаю беларускія ўлады правесці поўнае і празрыстае расследаванне справы аб смерці Алега Бябеніна, якое высветліць усе абставіны яго трагічнай гібелі».

• **Расійскія СМІ: Дзіўнае самагубства.** Адразу некалькі тэлеканалаў асвятлялі сцэны развітання з Алегам Бябеніным у панядзелак 6 верасня. Расійская газета «Известия» надрукавала артыкул пад загалоўкам «Дзіўнае самагубства». У ім гаворыцца пра паспешлівыя высновы следства і недавер да іх блізкіх нябожчыка.

## «Ніякага крыміналу ў нас ніколі не было»

Жыхары вёскі Пярхурава нічога не бачылі і не чулі.

Пярхурава, дзе меў загарадны дом Алег Бябенін, знаходзіцца зусім блізка ад Мінска. Усяго 15 кіламетраў ад сталіцы ў гродзенскім кірунку — і ўказальнік на вёску. Вялікую, на некалькі дзясяткаў цагляных катэджаў і з дзясятак старых драўляных хатак.

Мясціны тут прыгожыя, а зямля дарагая — непадалёку на схілах узгоркаў размясціўся гарналыжны курорт Якуцкія горы і найвышэйшы пункт Беларусі — гара Дзяржынская. Да Крутагор'я, парку экстрэмальнага адпачынку, зусім рукой падаць — менш за кіламетр па прасёлкавай.

Вялікія грошы мінчукоў кардынальна змянілі выгляд Пярхурава. Як у шмат якіх іншых вёсках непадалёку ад сталіцы, каля старых сялянскіх хатаў павырасталі двух-, а то і трохпавярховыя катэджы. Такіх заўсёдных атрыбутаў беларускай вёскі, як бабулек на лавачках, тут не сустрэць. Ці то гаспадары пераехалі на прыроду без тых самых бабулек, ці то жыхары хаваюцца ў хатах ад будаўнічага пылу. А будоўля ідзе няспынна. Уздоўж цэнтральнай вуліцы можна налічыць з дзясятак дамоў, дзе туды-сюды бегаюць працаўнікі.

Пра трагічнае здарэнне 3 верасня яны калі і чулі, то праз трэція вушы: «Людзі кажуць, што нехта вядомы засіліўся, але мы ж не тут жывём, таму не надта цікавіліся. На выходных міліцыі панаехала — аж прайсці не было дзе, — кажа мужчына ў спецоўцы. — Мясцовых жыхароў апытвалі цэлы дзень, а да нас нават не падыходзілі». «Дык і мясцовыя таксама нічога не ведалі», — удакладняе ягоны калега.

Разбітая пясчаная дарога Пярхурава не дазваляе рухацца хутка. Па ёй машыны не едуць, а крадуцца. Тут можна праехаць і апоўдні, і апоўначы фактычна незаўважна для суседзяў. Адзіны крытэр, каб вызначыць, ці дома гаспадар, — запаленае ўвечары святло.

Двухпавярховы цагляны дом Алега Бябеніна нічым не вылучаецца сярод іншых катэджаў. Звычайны двор — акуратны, дагледжаны, але пусты.

Што адбылося ўнутры, для жыхароў Пярхурава, як і для ўсёй краіны, загадка. «Зразумейце, гэта ж не вёска, дзе ўсе пра ўсіх ведаюць. Цяпер усё новыя людзі прыязджаюць, хтосьці хоча з суседзямі знаёміцца, хтосьці не хоча. Калі чалавек жыве пастаянна, то, канечне ж, прымільгаецца. А калі толькі па выходных... Адзінае, што чулі пра Алега, што ён недзе журналістам працуе. Гэта на выходных мы даведаліся, што ён кіруе адным з самых вялікіх сайтаў апазіцыі. Па ім і не скажаш», — расказвае сусед, які жыве праз тры дамы ад Алега.

З недахопам інфармацыі сутыкнулася і следства, кажуць мясцовыя жыхары. Апыталі шмат каго, а карысная нічога не даведаліся.

У які дзень Алег Бябенін прыехаў у Пярхурава і ці прыехаў ён адзін — дагэтуль загадкі. «Не пабягу ж я на кожную машыну глядзець?! Так я ім і сказаў», — тлумачыць гаваркі сусед.

Галоўнае пытанне без адказу — усё ж самагубства ці забойства?

Супольная думка суседзяў схіляецца да таго, што, хутчэй за ўсё, адбылося самагубства. Яна засноўваецца толькі на адным неаспрэчным аргуменце: «Ніякага крыміналу ў нас ніколі не было». Але варта спытаць, якія ж маглі быць матывы у чалавека, як іх меркаванне пачынае хістацца: «Можа, і не самагубства. Хто яго ведае? Але чалавека ж усё роўна не вернеш».

**Яўген Васількоў**

## Злавесны знак усім нам

Версіі смерці Алега Бябеніна.

Гавораць паліттэхнолаг Аляксандр Фядута, блізкі да кампаніі «Гавары праўду», і галоўны рэдактар часопіса ARCHE Валер Булгакаў.

«Як просты грамадзянін магу сказаць, што гэтая трагедыя выглядае надзвычай злавесным знакам для ўсіх нас, — кажа Валер Булгакаў. — У тым ліку і для ўладаў, якім у такой сітуацыі трэба забяспечыць поўную празрыстасць расследавання справы. Я не быў знаёмы з гэтым чалавекам, таму не магу меркаваць пра ягоныя асабістыя якасці. Калі ж дапускаць версію самагубства, то ёсць мізэрная магчымасць таго, што гэта стала вынікам нейкай няўпэўненасці ў сілах апазіцыі, ва ўласным праекце. Што да версіі пра магчымую датычнасць нашых спецслужбаў ці іншай сілы да смерці Бябеніна, то ў сітуацыі, калі ўсе ніткі следства знаходзяцца ў руках акурат спецслужбаў, даказаць нешта будзе надзвычай складана».

Аляксандр Фядута пераканaны, што смерць Алега Бябеніна нікому не выгадная. «Бо сама па сабе смерць нікому не выгадная. Гэтая трагедыя не патрэбная ні самой «Хартыі» — на сёння досыць эфемернай структуры. Смерць чалавека — завысокая цана для падвышэння рэйтынгу і прыцягнення ўвагі грамадскасці. Нявыгадна гэта і рэжыму, які і так перажывае не найлепшы час. Алега Бябеніна я памятаю па працы ў газеце «Імя». Ён быў вельмі спакойным і ўзважаным чалавекам. Я не выключаю ніякіх версій — ні палітычнай, ні пабытавай. Але і ў самагубства не веру».

**Запісаў Сямён Печанко**

# «Яшчэ адзін артыкул, і табе п…ц»

**Пасля публікацыі ўласных версій смерці Бябеніна шэф-рэдактарка «Народнай волі» Святлана Калінкіна атрымала ананімны ліст з пагрозамі.**

«Гэтую паштоўку мне кінулі ў паштовую скрыньку ў нядзелю ў абед, — расказала «НН» Святлана Калінкіна. — Тэкст набраны на няклясўскіх паштоўках на кампутары, рознымі шрыфтамі». Паштоўка прыйшла не па пошце, яе кінулі ў скрынку, нібыта паказваючы, што ведаюць, дзе жыве журналістка. Невядомыя напісалі: «Калінкіна — прадажная мярзотніца. Гавары праўду пра сябе. Жыві і бойся. Распачатае паляванне на здраднікаў. Яшчэ адзін артыкул, і табе п...ц». Ні хто яны, ні пра які артыкул гаворка — у тэксце з пагрозамі ні слова.

Чаму выкарысталі паштоўку «Гавары праўду»? Пэўная логіка ў гэтым ёсць, кажа журналістка. Не так даўно яна напісала крытычны артыкул на адрас Уладзіміра Някляева, таму ў апошнім здарэнні праглядаецца жаданне згуляць на гэтым канфлікце поглядаў.

С.Калінкіна лічыць, што гэта рэакцыя на яе артыкул «Пятля», публікацыя якога ў інтэрнэце падазрона паратэрдзнічала з'яўленню ліста з пагрозамі. У артыкуле аналізаваліся абставіны смерці Алега Бябеніна і агучваліся пэўныя версіі.

Найперш яна выказвае сумневы ў версіі следства пра самагубства. А потым — здагадкі, каму была патрэбная смерць вядомага журналіста.

Гэта хутчэй не бліжэйшае атачэнне Лукашэнкі, мяркуе яна. Бо гэта азначае «падкінуць дроў у вогнішча, ускалыхнуць усё тое, на што ўжо крыху забыліся — самагубствы актывістаў апазіцыі пасля шантажу КДБ, так і не расследаваныя забойствы журналістаў Веранікі Чаркасавай і Васіля Гроднікава, дзіўныя смерці Анатоля Майсені, Генадзя Карпенкі і гэтак далей».

Не бачыць за смерцю калегі Калінкіна і «знешнія сілы» — намёк на Расію, — бо яны, «жадаючы ўзмацніць, пагоршыць, ачарніць, абвінаваціць Лукашэнку, знайшлі б больш «рэзанансную ахвяру». І зрабілі б усё так, што ні ў кага не засталося б сумненняў, што гэта забойства».

І не апазіцыянеры, якія «мегафон да мітынгу таемна давезці не могуць, абавязкова ў міліцыю патрапяць».

Урэшце журналістка прыходзіць да высновы пра існаванне ва ўладным асяродку цэнтра сілы, незадаволенай прыходам да ўлады «маладых ваўкоў» і, адпаведна, сыходам у цень «старой гвардыі». Калінкіна звязвае гэты цэнтр сілы з былым «эскадронам смерці», які падазравалі ў забойстве лідараў апазіцыі ў канцы 1990-х. Яна мяркуе, што з дапамогай такіх вось рэзанансных здарэнняў гэтая сіла спрабуе давесці прафесійную непрыдатнасць «маладняку» і яго няздольнасць кантраляваць сітуацыю.


Я хочу сказать правду!
Если вы знаете правду о важной проблеме, расскажите ее сейчас. О проблемах нужно говорить, чтобы их можно было начать решать.

Калинкина, продажная мразь, ГОВОРИ ПРАВДУ про себя. Живи и бойся. Начата охота на предателей. Еще одна такая статья и тебе П...Ц.

Кому: Администрация Президента Республики Беларусь. Карла Маркса 38, Минск 220016, Беларусь
Опустите открытку в любой почтовый ящик и она будет доставлена по адресу

Факт пагрозы сабе журналістка расцэньвае акурат як чарговую спробу зрабіць і без таго няпростую сітуацыю яшчэ больш напружанай.

**Сямён Печанко**

# Мікалай Халезін: Гэта не яго псіхатып

**Пра Алега Бябеніна ўзгадвае сябар, кіраўнік «Свабоднага тэатра».**

За 16 год сяброўства ў мяне не было ніводнай нагоды, каб адчуць, што ўсё можа скончыцца вось так. Не яго характар, улічваючы, як моцна ён любіў свайго сына.

Ён ніколі не быў дэпрэсіўным чалавекам. Наадварот, гэта быў чалавек, які суцяшае, супакойвае іншых, а не яго ўціхамірваюць. Я бачыў яго не дэпрэсіўным нават, а заклапочаным толькі аднойчы. Калі ён у мяне жыў нейкі час пасля разводу. То ён нават курыць не пачаў.

Неверагоднае пачуццё гумару. Алег і сам любіў пажартаваць і заўсёды гатовы быў падтрымаць у гэтым іншых. Так, у мяне ёсць знаёмыя людзі, пра якіх я магу сказаць, што яны схільныя да падобнага. Але гэта не пра Алега, не яго псіхатып.

Алег быў прафесіяналам, якіх, на маю думку, на пальцах адной рукі ў Беларусі можна пералічыць. У «Імя» ён прыйшоў, калі яму і 20 год не было. Хто б мог падумаць, што гэты хлопчык праз паўгода-год стане начальнікам аддзела навінаў? У пошуку навінаў яму роўных не было. Тое, якім моцным, папулярным стаў сайт Хартыі, дзякуючы Алегу, таксама само за сябе гаворыць.

Алег быў спакойным, адэкватным чалавекам. Без праблемаў з алкаголем і камунікацыяй, як гэта часта назіраецца ў журналісцкім асяродку. Ён знаходзіў мову з любым суразмоўнікам.

Працуючы журналістам, Алег неаднойчы трапляў у міліцыю. Мы яшчэ жартавалі, кажучы, што для дасягнення ўзроўню сапраўднага журналіста трэба неаднойчы пасядзець у пастарунку. Не да жартаў стала, калі пасля «Чарнобыльскага шляху» ў 1997-м яго выкралі і вывезлі за горад у лес, адабраўшы асабістыя рэчы. Алега прыстрашылі, каб пісаў памяней. Але яго гэта толькі больш мабілізавала. Ён злавіў папутку і, як толькі прыехаў у горад, адразу пайшоў у рэдакцыю. Па яго вачах я зразумеў, што ён насамрэч перажыў, хоць выгляду ён і не падаваў. Гэтыя выпадкі толькі гартавалі Алега.

Як чалавек неверагоднага характару ён сябе праявіў у часе нападу эрэн'эшнікаў на Андрэя Саннікава ў 1999-м. Ён са Змітром Бандарэнкам фактычна выратаваў жыццё Саннікаву. Трэба было бачыць, як ён адначасова біўся з некалькімі нападнікамі, адцягваючы ўвагу на сябе, спыняў аўто.

Цяжка пра гэта ўсё гаварыць. Шмат несупадзенняў у гэтай справе. Пакуль не магу пра іх гаварыць.

**Запісаў СП**

# Рэпартаж з пахавання калегі

**6 верасня на Усходніх могілках у Мінску быў пахаваны журналіст Алег Бябенін.**

«Страх, страх і страх! Вось мэта тых, хто гэта зрабіў. Каб напалохаць, паралізаваць незалежную прэсу», — старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна з цяжкасцю падбірала словы, гаворачы пра смерць Алега Бябеніна. Побач сцішана перагаворваліся людзі, якія выцягнуліся ў доўгую чаргу ў залу рытуальных паслуг на Альшэўскага. Развітацца з памерлым прыйшлі палітыкі Саннікаў, Севярынец, Мілінкевіч, Шушкевіч, Кароль, Івашкевіч, Баршчэўскі, лідар кампаніі «Гавары праўду» Някляеў, мастакі Марачкін і Шатэрнік, рэжысёр Хашчавацкі і тэлежурналіст Міндлін, музыкант Кулінковіч і блогер Ліпковіч. І, натуральна, калегі — рэдактары незалежных выданняў і шараговыя супрацоўнікі. А таксама неабыякавыя. чытачы. Усе з кветкамі. Белымі і чырвонымі ружамі і гваздзікамі. «Смерць Алега — гэта звяно аднаго ланцуга. Трагічнага ланцуга — забойства Веранікі Чаркасавай, знікнення Дзімы Завадскага, — казала Жанна Мікалаеўна. — Іх аб'ядноўвае адно — адсутнасць адказаў на пытанне, хто гэта ўсё зрабіў. Магчыма, мы даведаемся праўду пра ўсе гэтыя выпадкі толькі са зменай улады. Нас хочуць запалохаць, але я асабіста адчуваю, мае калегі, што гэта не ўдасца зрабіць. Мы будзем рабіць сваю працу, як і рабілі раней».

Апазіцыйныя лідары раздавалі інтэрв'ю. Спачатку іх галасы гучалі няўпэўнена, часта чулася «я не ведаю», «я не магу каментаваць». Але з кожнай новай просьбай рэпарцёраў выказацца фармулёўкі і галасы палітыкаў мацнелі, з'яўляліся металічныя ноткі. Аляксандр Мілінкевіч з паплечнікамі з'явіўся на Альшэўскага адным з апошніх. Яму, як і Літвіной, словы пра памерлага даваліся няпроста: «Я добра яго ведаў, Алег меў выдатнае пачуццё гумару, дзяліўся сваёй энергіяй з іншымі людзьмі. Я не хачу каментаваць таго, што здарылася, пакуль няма афіцыйных вынікаў. Аднак адзначу, што варта задумацца, каму была выгадная смерць Алега Бябеніна».

Развітанне з Бябеніным асвятлялі некалькі расійскіх тэлеканалаў. Супрацоўнікі РТР апытвалі палітыкаў з гваздзікамі ў руках. «У нас шмат пытанняў да следства, — гаварыў блізкі паплечнік Алега Бябеніна, Мікалай Халезін. — Чаму экспертыза зацягнецца на цэлы месяц, калі следства амаль адразу заявіла, што гэта было самагубства? Чаму ў пратаколах няма ні слова пра адмеціны на целе Алега, якія мы бачылі? Чаму ён выбраўся на лецішча адзін, чаго ніколі раней у жыцці не рабіў? Чаму ў доме была ідэальная чысціня, проста стэрыльная?»

На вуліцы рабілася нязвыкла горача. Аднаму з журналістаў зрабілася млосна.

На Усходніх могілках Алега Бябеніна пахавалі побач з дзедам. Апошняе слова сказаў Андрэй Саннікаў. «Алег заўсёды адчуваў вялікую патрэбу дапамагаць людзям. Ён не трымаў нянавісці да мярзотнасці, якая нас атачае. Ён сучасны чалавек і гэта само за сябе гаворыць». У лічаных метрах ад труны стаялі двое ў цывільным. У вачах ні каліва спагады, толькі засяроджанасць на працы. Час ад часу яны па чарзе рабілі справаздачы па мабільніках. Застракаталі фотакамеры — рэпарцёры рабілі рэпартаж. Спецыяльны рэпартаж — з пахавання калегі.

**Сямён Печанко**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

### Якім палітычным мэтам магла служыць расправа над Бябеніным?

Мэтам перадвыбарнага запалохвання незалежных СМІ? Бябенін кіраваў самым рэзкім з іх. Але такіх дзікіх метадаў расправы раней не ўжывалася. Чаму менавіта цяпер?

Яшчэ адна мэта, якую маглі пераследаваць невядомыя забойцы, — нагнятанне напружання напярэдадні выбараў.

На каго падае першае падазрэнне, калі ў аўтарытарнай краіне гіне пры цьмяных абставінах апазіцыйны журналіст?

Вядома, на тых, хто пятнаццаць гадоў зачыняў СМІ, біў камеры, садзіў журналістаў. Беларусь мае найгоршыя паказнікі свабоды прэсы ў Еўропе. У дэмакратычных краінах журналістаў не забіваюць па палітычных матывах.

Калі самагубства інсцэнізаванае, то хто тое мог зладзіць? Ніякі замежны эскадрон смерці не можа дзейнічаць у Беларусі, дзе ўсё пад кантролем. Гэта немагчыма. Нават Яндарбіева і Літвіненку ліквідоўвалі не ціха.

Кіраўнік дзяржавы мусіць узяць расследаванне пад асабісты кантроль. І яно павінна быць празрыстым.

Гэтая трагедыя магла быць справай тых сілаў, што хочуць стварыць хаос і пасеяць страх напярэдадні выбараў, — тады магчымы і іншыя здарэнні. У выпадку, калі ўсё спісаць на самагубства, гэта развяжа рукі забойцам.

Калі не будзе вартага даверу расследавання, значыць, гэтая справа стаіць у адным шэрагу са справамі Ганчара і Захаранкі.

# Хто яны — новыя анархісты?

Піша **Юльян Місюкевіч**.

Затрыманне анархістаў па падазрэнні атакі на амбасаду Расіі выклікае пытанні. Нават самі прыхільнікі левых поглядаў спрачаюцца наконт датычнасці паплечнікаў да інцыдэнту з кактэйлем Молатава.

Анархісты ў многіх краінах свету сапраўды ажыццяўляюць відовішчныя радыкальныя акцыі, напрыклад, атакі на дзяржаўныя і фінансавыя ўстановы, казіно.

«Анархісты сышлі ў субкультуру. Чымсьці нагадваюць секту, у якую цяжкавата трапіць», — скрушна кажа Лёлік Ушкін, першапачатковец беларускага анархісцкага руху, сузаснавальнік сатырычнага выдання «Навінкі», якое было зачынена ўладай. Лідары, па словах Лёліка Ушкіна, ёсць, але яны не публічныя асобы, стараюцца не пазіцыянаваць сябе ў грамадстве.

Загадкавых анархістаў запомнілі хіба што па «Чарнобыльскім шляху», дзёрзкіх акцыях з дымавымі шашкамі ды феерверкамі.

Анархізм у Беларусі мае амаль стагадовую гісторыю. Першыя згадкі пра анархістаў на тэрыторыі Беларусі сягаюць да рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. Тады ў гарадах пачалі з'яўляцца анархісцкія гурткі. Нешматлікія актывісты займаліся модным у тыя часы індывідуальным тэрорам.

Самі анархісты залічваюць да сваіх шэрагаў класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча, які ў студэнцкія гады, натхнёны творамі Бакуніна, спрабаваў узарваць самаробнай бомбай адміністрацыю роднай гімназіі.

Украінскія анархісты прызнаюць за куміра Нестара Махно, кіраўніка сялян часоў Грамадзянскай вайны 1918—1921 гадоў.

З 1991-га існуе Федэрацыя анархістаў Беларусі. Першай анархісцкай арганізацыяй на тэрыторыі СССР лічаць створаную ў перыяд «перабудовы» ў 1989 годзе маскоўскую Канфедэрацыю анарха-сіндыкалістаў (КАС), з якой шчыльна супрацоўнічала гомельская група анархістаў «Барацьба». Пасля жнівеньскага путчу ў 1991 годзе праз арганізацыйны і ідэалагічны крызіс КАС раскалолася на некалькі анархісцкіх груп.

Падчас выбараў у Вярхоўны Савет Беларусі ў 1995 годзе Левы студэнцкі рух («Левое студентское движение», «ЛСД») вылучаў свайго кандыдата ў дэпутаты, ажыццяўляўся збор подпісаў. Праграма анархісцкага кандыдата нагадвала здзек з практыкі перадвыбарных абяцанняў палітыкаў. Абяцалася, напрыклад, у выпадку прыходу да ўлады дабівацца генацыду пінгвінаў у Антарктыдзе і перафарбоўкі Дома Урада ў памаранчавы колер. «ЛСД» выдаваў некалькі газетаў: «Сейчас!», «Как стать предателем» і «Бухаровец Белоруссии».

Канкурэнтам анархістаў быў кандыдат ад Партыі Аматараў Піва (ПАП). Яго абвінавацілі ў піўным дылетанцтве ды выклікалі на дуэль, якая адбылася ў піўным бары «Свіслач» пры вялікім тлуме. Кожны бок прадставіў роўную колькасць чалавек. Хто ў суме больш вып'е — перамагаў. Піва для дуэлі прадстаўляла ПАП, анархісты дуэль прайгралі, затое бясплатна нажлукціліся.

У 1995-м у Мінску разгарнула дзейнасць «Антыпартыйная група «Чырвоны Жонд». На гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1995 годзе ля Дома Урада «Чырвоны Жонд» арганізаваў маніфестацыю. Акцыя праходзіла пад чырвонымі сцягамі з дзіркай на месцы сярпа і молата, пад лозунгамі «Далоў самадзяржаўе» і «Смерць капіталізму».

З тым жа лозунгам «Далоў самадзяржаўе» выйшаў пару гадоў таму ў Гомелі на мітынг 7 лістапада Юрась Глушакоў — яго адразу скруціла міліцыя. Цяпер Глушакоў, дарэчы, вылучаны ў прэзідэнты Беларусі ад Партыі Зялёных. Зялёныя і памяркоўныя анархісты блізкія па пазіцыях ва ўсім свеце.

Розніца між імі ў тым, што анархісты выступаюць супраць дзяржавы як такой, бо лічаць яе інстытутам узаконенага гвалту і прымусу. Дзяржава, паводле анархістаў, утварае палітычную ўладу, а капітал — эканамічную. Капіталізм і дзяржаўны таталітарызм, па анархісцкай ідэалогіі, будуць знішчаны, на іх змену прыйдуць рады працоўных і вольныя аб'яднанні, а самакіраванне станецца асноваю будучай сацыяльнай рэвалюцыі, да якой імкнуцца анархісцкія рухі.

Бездзяржаўнае кіраванне самі анархісты не звязваюць з хаосам і бязладдзем. Яны вераць, што грамадства здольнае да салідарнасці і ўзаемадапамогі.



**Анархісты падчас «Чарнобыльскага шляху» — 2010.**

## Пазняк пра мову: наркамаўка ці тарашкевіца?

### Нацыя пад прэсам шукае аптымальнае рашэнне.

Падчас свайго выступу на з'ездзе моладзі КХП-БНФ «Маладое Адраджэнне» ў Вільні 28 жніўня Зянон Пазняк расказаў пра сваё стаўленне да набалелага пытання аб правапісах.

«Для нас вельмі істотны мяккі знак. Гэта важная фанетычная прыкмета. Многія скончылі расейскую школу ці прыехалі, як Мулявін, і чытаюць, як напісана, і спяваюць «Ружы цвет». Як напісана, так і чытае. Па правілах «ц» змякчаецца , але правілы ніхто чытаць не будзе. Таму лепш напісаць, як раней было, «цьвет». Гэта правільна — графічна адлюстроўваць фанетыку.

Новая рэформа, якая зараз уступае у сілу, — гэта вынішчэнне мовы, яны якраз там не адлюстравалі мяккія знакі.

Што датычыцца тарашкевіцы, то прымаць яе стопрацэнтна таксама не трэба. Тарашкевічам гэта рабілася на тым узроўні, з асновай той культуры, якая была больш у польскім асяроддзі («філялёгія»). Ужо практыка паказала, што гэта трошку штучна. Нічога страшнага няма, калі мы кажам «філалогія», «логіка» — гэта натуральна для беларуса.

### Важна, каб вы гаварылі па-беларуску і не адрывалі адзін аднаму галоваў.

Раней рэформу з наркамаўкай праводзілі ворагі Беларусі з палітычнымі мэтамі, а цяпер другія ворагі праводзяць. Мы ж бачым, што новую рэформу правялі тыя, хто супраць мовы, хто нават не гаворыць па-беларуску.

Як вам прытрымлівацца? Сітуацыя такая, што можаце прытрымлівацца аднаго і другога. Важна, каб вы гаварылі па-беларуску і не адрывалі адзін аднаму галовы. Тарашкевіца ці наркамаўка — не істотна, бо ўсе мы знаходзімся пад прэсам антыбеларускай палітыкі, таму трэба гаварыць па-беларуску.

Я не прытрымліваюся цалкам тарашкевіцы ці наркамаўкі, так як і «Дзеяслоў» не прытрымліваўся. Многія знаходзяць сярэдняе і нічога дрэннага ў гэтым няма.

Мы знаходзімся ў такім стане, што нацыя пад прэсам шукае аптымальнае рашэнне. Гэта пладатворны перыяд шукання, які прывядзе да выніку. Наперадзе ў нас Адраджэнне, і мы ўсё прывядзём у парадак».

**Запісала Наста Шамрэй**

## Невераходная смерць

### З Алегам Бябеніным мы пазнаёміліся гадоў пятнаццаць таму, калі ён прыйшоў у газету «Имя». Піша **Віталь Тарас**.

У поўным сэнсе знаёмствам гэта цяжка назваць — проста віталіся пры сустрэчы, часам абменьваліся некалькімі словамі. Ён быў тады зусім маладым хлопцам — адным з тых, што прыйшлі, дакладней сказаць, уварваліся ў журналістыку на грэбні пераўтварэнняў пасля набыцця незалежнасці Беларуссю. Гэта іх, у першую чаргу, улада абазвала «нячэснымі».

Для мяне, як і для дзясяткаў тысяч чытачоў, дакладней — «тых, хто ўмее чытаць» (такі быў дэвіз выдання, заснаванага як дадатак да «БДГ» Пятра Марцава), найлепшай характарыстыкай была сама газета. Дасціпная, яскравая, добра інфармаваная, іранічная, яна стала новым словам у журналістыцы, якая тады шмат у чым захоўвала родавую рысу савецкай прэсы — шэрасць. На жаль, захавалася гэтая рыса і па сёння.

Газету «Имя» можна было назваць якой хочаце, але толькі не шэрай. І немалая заслуга ў тым належала Алегу Бябеніну, які даволі хутка стаў намеснікам рэдактара выдання.

Потым была «Хартыя'97», вядомы сайт. Хто б і што ні казаў пра яго, несумненна адно — для таго, каб зрабіць гэты сайт, патрэбны былі энергія, прафесіяналізм і немалая грамадзянская мужнасць.

Яшчэ ў першыя гадзіны пасля паведамлення пра смерць журналіста, калі не было ніякай інфармацыі пра яе прычыны, інтэрнэт ужо віраваў.

Адзін з першых водгукаў на сайце «Нашай Нівы»: «Навалач! Скаты! Ублюдкі!» І такіх водгукаў было шмат. Характэрны факт — нікому не трэба тлумачыць, хто маецца на ўвазе, усе без таго ўсё разумеюць.

Але параўнайце гэтыя словы з тымі, што прагучалі за некалькі дзён да таго з вуснаў кіраўніка дзяржавы: «Падонкі і нягоднікі!» Адрасат таксама не быў названы, але з кантэксту заявы Аляксандра Лукашэнкі наконт правакацыі з падпалам службовага аўтамабіля ў пасольстве Расіі і рэакцыі расійскага боку ўсё было ясна.

Справа не ў экспрэсіўнай лексіцы, справа ў атмасферы, якая склалася ў Беларусі. Смерць журналіста падазрона лёгка ўпісалася ў падзеі апошніх дзён і месяцаў. Успомнім. Летась у сакавіку скончыла жыццё самагубствам праваабаронца Яня Палякова. Яе заўчаснай смерці папярэднічаў здзеклівы фельетон у газеце «Беларусь сегодня», жанчына высмейвалася за тое, што асмелілася ўступіць у канфлікт з мясцовым міліцыянерам. Суд выступіў, вядома, не на яе баку.

Дагэтуль не знойдзены датычныя да зверскага забойства журналісткі Веранікі Чаркасавай.

Дагэтуль невядомыя абставіны знікнення тэлеаператара Змітра Завадскага, а таксама іншых зніклых. Злачынствы не раскрыты. Аляксандр Лукашэнка, кажучы пра здарэнне ў пасольстве Расіі, завершыў сваю тыраду словамі пра тое, што «адказнасці мы з сябе не здымаем».

Што ж, улада павінна несці адказнасць і за ўсё пералічанае вышэй.

Міжволі ўспомніў апавяданне майго бацькі з яго літаратурнай спадчыны — «Невераходная смерць». У яго аснове рэальны эпізод з бацькавага партызанскага юнацтва. Некалькі партызанаў зайшлі ў вясковую хату і ўбачылі, што там ідзе развітанне з нябожчыкам. Першая думка была: хто забіў? Немцы? Паліцаі? Нечакана аказалася, што чалавек проста памёр ад старасці. Падлетка, дый ягоных крыху старэйшых баявых сяброў, якія звыклі жыць на вайне штодня побач са смерцю, з небяспекай, гэта ашаламіла.

Смерць нашага калегі, зразумела, зусім іншы выпадак. Ён вымагае самага дасканалага расследавання. Але адчуванне такое, што вайна — псіхалагічна — усё яшчэ не скончылася.

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

### Самі ў сябе скралі ўраджай

Скрозь ля дарог цягнуцца зжатыя і пераараныя на зіму палі. На іх густой шчоткай выкінулася маладое жыта. Гэта зелянеюць мільёны тонаў, якіх недалічыліся падчас жніва. У пагоні за паказнікамі, пад начальніцкі крык камбайнеры на максімальнай хуткасці ганялі камбайны па полі. А каб жаць без стратаў, нельга спяшацца. Але вялікая частка ўраджаю была прынесеная ў ахвяру «плану»: важней было адрапартаваць, што скончылі жніво ва ўстаноўлены кіраўніцтвам час.

**Яўген Голуб, Валожын**

# Малодшы брат Глобуса

## Ён вырас у сям’і беларускага пісьменніка, а выдае расійскія кнігі.

Ён з лёгкасцю пісаў масавыя дэтэктывы пад псеўданімам Андрэй Варонін. Але не меншым поспехам карысталіся тэатральныя пастаноўкі па яго п’есах. Ён зарабляе грошы выданнем расейскамоўных кніг, але адчувае сябе гульцом на беларускім літаратурным полі.

Міраслаў Адамчык узначальвае беларускую рэдакцыю расійскага выдавецкага дома «АСТ». Яго офіс знаходзіцца ў цэнтры Мінска. А штат налічвае толькі два чалавекі: ён і брат, Адам Глобус.

Брат — асоба для Міраслава паважаная. Гэта яшчэ і кампаньён, і сябра. З Глобусам ён разам напісаў і першы раман, які стаў пачаткам кар’еры Андрэя Вароніна. Міраслаў паказвае шафы з выдадзенымі кнігамі, якіх у офісе толькі пяць тысяч. «І столькі ж тут не змясцілася». Некалькі паліцаў займае акурат серыя бульварных раманаў. Побач і дыскі з фільмамі, і серыяламі паводле кніг.

«Андрэй Варонін пачаўся з рамана пра забойства Машэрава «Заўсёды светла каля турэмных муроў». Твор пераклалі на расейскую мову, выдалі і прадалі ў Расіі. Але Адам Глобус і Міраслаў Адамчык на расійскім рынку — гэта нічога не значыць. Нас папрасілі прыдумаць простае расейскае прозвішча. Цяпер напісана 150—170 дэтэктываў».

Раманы пішуць не толькі Міраслаў і яго брат. Яны наймаюць для гэтага іншых, тых, хто адчувае ў сабе здольнасці і хоча зарабіць. Такую працу паспелі назваць «працай літаратурных рабоў». А братам Адамчыкам закідаюць тое, што яны спрыяюць абалваньванню людзей масавым чытвом.

«Я лічу, што Андрэй Варонін — класны праект. Ёсць лепшае, горшае. І тым не менш, гэта паспяховы брэнд. А закіды пра «літаратурных рабоў»... Ёсць аўтары, якія працуюць з намі. Але працуюць не таму, што яны рабы».

Першай кнігай па-беларуску сам Міраслаў дэбютаваў у 1992 годзе. «Забойства на Каляды» — дэтэктыўная аповесць і апавяданні. Сёння ж дэтэктываў, з якіх пачынаў, не піша. «Мне ўжо нецікава. Не лічу, што пісаць белетрызаваную літаратуру мне сёння важна».

Але аўтара менавіта па дэтэктывах і запомнілі. А пісаць пачаў пад уплывам Уладзіміра Караткевіча, які жыў на адной лесвічнай пляцоўцы з Адамчыкамі.

Бацькавы творы не натхнялі? «Да бацькавых твораў трэба было дарасці. Караткевіч — гэта добры старт, пачатак у літаратуры. Гэта літаратура ўсё-ткі для падлеткаў».

Затым былі пастаноўкі спектакляў па п’есах, напісаных у суаўтарстве з Максімам Клімковічам. П’еса «Францыск Скарына, альбо Нагавіцы святога Георгія» ішла гадоў пяць-шэсць. А «Чорны квадрат» ужо пятнаццаць гадоў ставяць на сцэне Тэатра беларускай драматургіі. «Мы з Максімам пісалі мюзікл. Нам хацелася, каб чалавек прыйшоў паглядзець у тэатры нешта лёгкае, забаўляльнае па-беларуску, але разам з тым даведаўся нешта карыснае, цікавы факт».

У 2005 выйшаў «Зборнік» — том, які ўвабраў прозу, драматургію і паэзію Міраслава. Пасля — зноў зацішша: перавыдаваліся толькі ранейшыя творы. «Чаму я не выдаю кніжак? Я напісаў апошнімі гадамі дзве кнігі: «Гарэлка» і «Кніжка пра ката». Але каб выдаць іх, трэба спачатку адрэдагаваць. А я не знайшоў чалавека, блізкага мне, каму мог бы даверыць свае творы. Безумоўна, і мала пішу».

Але дзеліцца задумамі на будучыню. «Калі я вазьмуся яшчэ пісаць, то гэта будзе дзённік». І наракае на тое, што з інтэрнэт-дзённікаў знікла шчырасць. «Шмат няшчырай публічнасці. Чытаю дзённікі. Шмат перапостаў: нешта пачуў ад кагосьці, анекдот пераказаў. А вось пра што сапраўды думае, перажывае, такога проста няма. Знікае давер да апублікаванага ў інтэрнэце слова. Слова перастала ўплываць на свядомасць. Пісьменнікі заводзяць ЖЖ і хлусяць там».

Міраслаў і сам вядзе ЖЖ. Але змяшчае там усё больш фотаздымкі. «Да прафесіі я не давёў гэты занятак, бо з яго не жыву. У мяне ёсць фотастудыя. Часам я раблю камерцыйныя праекты. Гэта форма творчасці».

Ён разважлівы кнігавыдавец. Не ўкладае грошы ў праекты, якія не акупяцца. Не разлічвае на гранты. Кажа, што беларуская кніга не купляецца, бо айчынныя аўтары слаба пішуць. І крытыкаў няма, каб іх узровень падцягваць. «У нас з літаратурай кепска, а крытыкі ніколі не было».

Але ў 2008-м Адамчыкі вырашылі стварыць кніжную серыю «Сучасны беларускі дэтэктыў». Разлічвалі, што кнігі будуць прадавацца ў гіпер- і супермаркетах. Але з выхадам «Замка» Адама Глобуса і «Кароны» Міраслава ўсё скончылася. «Праект кепска прадаўся. Ён не стаў камерцыйна паспяховым, як мы чакалі. Мы не разлічвалі, што пачнецца такі глыбокі эканамічны крызіс. І кніжкі «праселі» па продажах».

Займеўшы яшчэ ў 1990-х досвед у кінаіндустрыі, Міраслаў не бачыць пакуль перспектывы і ў беларускага кіно. Ён крытыкуе працу «Беларусьфільма». «Кінастудыя ніколі не займалася беларускім кіно. Я не разумею, навошта беларусам экранізаваць Мерымэ (фільм «Масакра» — С.М.) за дзяржаўныя грошы. Мяне гэта абурае. Я плачу падаткі, за якія здымаюць кіно, якое не мае дачынення да Беларусі. Збіраюцца экранізаваць Яна Баршчэўскага. Паляк, які да нас не мае ніякага дачынення, прыцягнутае ўсё за вушы. А творы важныя для Беларусі, якія варта было б экранізаваць, не здымаюць». І прапаноўвае экранізаваць «Слова пра паход Ігаравы». «Твор, які вывучаецца ў школе, які аб’ядноўвае ўсходніх славян. Гэта рыцарскі раман з элементамі фантастыкі. Твор, які кладзецца ў кіно. Не думаю, праўда, што «Беларусьфільм» зможа зняць яго».

У 1990-х Міраслаў з братам напісаў сцэнар па «Тутэйшых» Янкі Купалы. А на замову Міхаіла Пташука яны стварылі сцэнар спецыяльна пад Галіну Макараву і Стэфанію Станюту. Але адведзеная Макаравай роля вясковай жанчыны актрыцы не спадабалася. І фільм не знялі.

...Міраслаў жыве ў Мінску, а любіць Барселону. «Але я там чужы. Нават праз пятнаццаць гадоў паездак у гэты горад я разумею, што ніколі не стану каталонцам. У Мінску я свой». Не прамяняў ён родны горад і на Маскву, калі прапанавалі кватэру ў расійскай сталіцы. «Жыць у Маскве — невыносна. Я там дыхаць не магу. І адносіны ў Расіі азіяцкія». Але ці не найбольш яго засмучае тое, што «выдавецкі бізнэс не перадаецца ў спадчыну. Ён існуе, пакуль мы з братам жывём». Чаму сына не рыхтуе ў змену? «Я не ўплываю на сына. Існуе канфлікт пакаленняў. Каштоўнасці, якія для мяне існуюць, маім дзецям нецікавыя. На шчасце, нашы дзеці яшчэ гавораць па-беларуску. Гэта адзінае, што я мог зрабіць».

**Сяргей Макарэвіч**



**Міраслаў Адамчык (Міраслаў Шайбак)**

нарадзіўся 6 жніўня 1965 у Мінску. Скончыў філфак БДУ. Працаваў у часопісах «Беларусь» і «Бярозка». Аўтар кніг «Забойства на Каляды», «Зборнік», «Карона». Перакладае з японскай. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Коні, людзі, крылы

**Працяг са старонкі 2.**

На тле нашага савецкага мастацтва нечаканым дысанансам аказалася скульптура Анатоля Арцімовіча, якога ведаюць па пано на фасадзе Дома модаў на Нямізе: эскіз помніка ў Курапатах з выяваю пакутніка, распятага на савецкай зорцы.

Прытым на выставу, лішне казаць, не патрапілі творы сяброў суполкі «Пагоня»: Марачкіна, Пушкіна ці Маркаўца.

Моладзь, якую ўперамежку з настаўнікамі выставілі ў ніжніх залах, адбіралася з ліку стыпендыятаў «Спецыяльнага фонду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі». Большасць твораў, прадстаўленых маладзейшымі, — камерцыйныя, часам і проста кічавыя.

Паводле словаў арганізатараў, выстава «Зямля пад белымі крыламі» стане месцам для распрацоўкі дзяржаўнай стратэгіі ў мастацтве. Некалькі генерацый мастакоў дзесяцігоддзямі салідарна ратавалі гонар нацыі, уздымаючы свой голас у абарону мовы, скарбаў нацыянальнае культуры і роднае прыроды. Цяпер надышлі іншыя часы. Якой будзе дзяржаўная стратэгія і надалей, стала відавочна на гэтай выставе. Маляваць трэба агульназразумела. Ніякіх жартаў, ніякага крытыцызму. Дзяржава будзе падтрымліваць тое, што можна ў чынавенскім катэджы павесіць. Напрыклад — пейзажы, хоць бы і самога дырэктара музея Пракапцова, які прадставіў свой твор таксама.

Знівеляваныя тэмы хрэстаматыйных партызаншчыны і беларушчыны. Крый Божа, аніякіх «Пагоняў»! Героямі абраныя Ленін, касманаўты і Мулявін. І шмат коней. Крылатых і бяскрылых.

Але ў любым разе, выстава «Зямля пад белымі крыламі» і іншыя экспазіцыі ў яе фармаце — самае відовішчнае мерапрыемства гэтага года.

# Частка XI. Рагвалод: з Нарвегіі ў Полацк

Піша **Алег Дзярновіч.**

Працяг. Пачатак у №26, 28, 30, 39, 47 за 2009 год, №7, 22, 27, 29, 32 за 2010 год.

## Суверэнізацыя Полацка

Да другой паловы X ст. Полацк падышоў, маючы пэўныя сувязі з Кіевам — цэнтрам Русі, але застаючыся адчувальна самастойным. У легендарным паходзе 907 г. Алега на Канстанцінопаль, калі рускаму князю ўдалося дэмаралізаваць грэкаў — ён паставіў на колы свае караблі і паехаў па сушы, — брала ўдзел полацкая дружына. Кожны ўдзельнік («на ключ» — на ўключыну) атрымаў тады па 12 грыўняў срэбра (каля 4 кг) кантрыбуцыі. Менавіта пасля гэтай удалай выправы Алег здабыў мянушку Вешчы — той, хто прадбачыць будучыню. Але ўжо ў 944 г., калі Ігар (старажытна-ісландскае Ingvar), сын Рурыка, пасля новага паходу падпісваў мірную дамову з Візантыяй, у пераліку гарадоў-удзельнікаў Полацк не прыгадваецца. Гэта можа азначаць, што Полацк не быў у ранейшай залежнасці ад Кіева. Як гэта ўдалося Полацку?

Пасля смерці Алега Вешчага каля 912 г. усю ўладу нарэшце атрымаў сын Рурыка Ігар. Падчас свайго княжання ён зазнаў шэраг буйных няўдач. У 940 г. руская дружына ў Крыме пацярпела паразу ад хазараў і пад ціскам каганата ў 941 г. мусіла здзейсніць няўдалы паход на Канстанцінопаль. Уплыў Хазарскага каганата на палітыку Кіева рэзка ўзмацніўся. Да таго ж, Ігар мусіў саступіць збор даніны з угліччаў і драўлянаў свайму паплечніку, ваяводу Свенельду. Як бачым, улада кіеўскага князя моцна аслабела. У 945 г. Ігар увогуле загінуў у паходзе на Паўднёвае Палессе. З-за знешнепалітычных няўдач на Русь перастала прыходзіць візантыйскае срэбра. Прагныя да грошай дружыннікі змусілі князя Ігара рушыць на драўлянаў. Тых, абураных новым накладаннем даніны, забілі кіеўскага князя.

Праз дваццаць пяць гадоў у лісце да спадкаемца Ігара князя Святаслава візантыйскі імператар армянскага паходжання Ян Цымісхі (925—976) нагадаў таму пра лёс бацькі, якога ён называе Інгерам. Візантыйскі гісторык Леў Дыякан у сваёй фундаментальнай працы «*Гісторыя*» пераказаў змест гэтага ліста і абставіны смерці князя, выкладзеныя там. Імператар паведамляў, што Ігар накіраваўся ў паход супраць нейкіх германцаў, але быў схоплены імі ў палон, прывязаны да вершалін дрэў ды разарваны папалам. Яшчэ гэты ліст цікавы тым, што паказвае, як у X ст. яшчэ захоўвалася гістарычная памяць пра знаходжанне готаў на Палессі ў II—IV стст.

**За гісторыяй са сватаннем Рагнеды стаялі сур'ёзныя гандлёвыя супярэчнасці. Полацк панаваў над асобным дзвінскім адгалінаваннем гандлёвых шляхоў і быў канкурэнтам Ноўгарада, а таксама меў эканамічныя падставы для адасаблення ад Кіева. У падзеях IX—X стст. так часта прыгадваецца гандаль, бо прадуктыўнасць сельскай гаспадаркі ў тыя часы была невысокая — яна забяспечвала выжыванне чалавека і ўтрыманне нейкага адміністрацыйнага апарату. Узбагаціцца ж можна было толькі двума шляхамі: рабаўніцтвам, альбо гандлем. Транкантынентальны гандаль даваў проста звышпрыбыткі.**

Потым Ігарава ўдава Вольга жыўцом закапае правадыра драўлянаў Мала і ўсё ягонае пасольства, якое прыехала сватацца да Вольгі. Відавочна, нашыя маральныя крытэры не дапамогуць разабрацца ў падзеях таго часу і ўчынках абодвух бакоў.

## Нарвежскі ўцякач

Мінае ж яшчэ чвэрць стагоддзя, і мы даведваемся імя полацкага князя — ім стаў Рагвалод, які, паводле летапісу, прыйшоў «з-за мора». Для полацкага дынастычнага радавода гэтае імя вельмі важнае, бо яно — першае з вядомых. Мы не ведаем, як звалі ярла, якога ў 862 г. Рурык накіраваў у Полацк. Таксама не ведаем і імя князя, які ўзначальваў полацкую дружыну ў паходзе 907 г. на Канстанцінопаль.

Адносна ж паходжання Рагвалода выказваліся супрацьлеглыя версіі. Яго лічылі нашчадкам мясцовай племяннай знаці і на першы погляд вельмі простая інтэрпрэтацыя імя полацкага валадара («уладар рога», у сэнсе — мыса) нібы давала для гэтага падставы — так успрымаў гэтае імя і Мікола Ермаловіч. Шукаліся заходнеславянскія і прускалітоўскія адпаведнікі гэтага імя, у якіх таксама прысутнічаў бы «валадарны» змест. Але лінгвісты засцерагаюць ад такіх вельмі простых моўных аналогій.

Калі браць пад увагу асаблівасці алітэрацыі (паўтору аднолькавых альбо аднародных зычных), гістарычны кантэкст і паведамленні летапісаў, то, хутчэй за ўсё, імя *Рагвалод* можа быць славянскай трансфармацыяй скандынаўскага імя *Ragnvaldr* ці *Rögnvaldr*, пашыранага найперш у заходнескандынаўскім, ісландска-нарвежскім культурным коле. Калі гэта так, то якія вядомыя са скандынаўскай гісторыі асобы могуць прэтэндаваць на тое, каб быць Рагвалодам Полацкім?

Скажам шчыра: у легендарных скандынаўскіх сюжэтах і імёнах лёгка заблытацца, калі не вывучаць іх адмыслова. Таму падамо тут толькі вынікі аналізу і дыскусій апошняга часу, у якіх улічваюцца факты скандынаўскай гісторыі. Алег Латышонак і Алесь Белы дапускаюць магчымасць атаясамлення Рагвалода з Рагнвальдам, сынам Эйрыка Крывавая Сякера, які быў сынам нарвежскага караля Гаральда Гарфагра (Цудоўнавалосага), што валадарыў з 863 г., каля 900 г. аб'яднаў краіну, а ў 933 г. адмовіўся ад улады. Усе нарвежскія правадыры, якія ў сярэдзіне X ст. мелі званне «конунг», былі нашчадкамі гэтага караля. І таксама з родам Гаральда Цудоўнавалосага звязвае Рагвалода расійскі даследчык Юрый Канавалаў, толькі бачыць у ім Рагнвальда Славутага — сына (ці стрыечнага брата) караля Гаральда.

Пра Рагнвальда і яго бацьку Эйрыка хронікі пішуць наступнае. Пасля смерці Гаральда Эйрык пачаў аднаасобнае панаванне з забойства сваякоў і патэнцыйных прэтэндэнтаў на ўладу, ад чаго і атрымаў мянушку Крывавая Сякера. Іншы сын Гаральда, Гакан Добры, які выхоўваўся пры двары англійскага караля, здолеў прыцягнуць на свой бок нарвежскі народ. Эйрык быў вымушаны ўцякаць з краю. У 954 г. гэты нарвежскі ўладар загінуў у бітве з англасаксамі. Сыны Эйрыка ўключыліся ў барацьбу за нарвежскую карону ўжо з дапамогаю данаў. У імкненні да ўлады нашчадкі былога караля аддавалі перавагу жорсткім звычаям свайго бацькі і забівалі сваіх стрыечных братоў. Адзін з іх сыноў, Олаф Тругвасан, дарэчы, мусіў ратавацца ўцёкамі, трапіў у рабства да эстаў, але нарэшце знайшоў прытулак у князя Уладзіміра ў Ноўгарадзе. Тым часам адзін з сыноў Эйрыка, Рагнвальд (ці яшчэ, Рагнфрод), каля 971—972 гг. зрабіў спробу адваяваць Нарвегію, але няўдала.



**Пакаранне князя Ігара. Гравюра Фёдара Бруні (XIX ст.).**

Рагнвальд правёў сваё дзяцінства ў Нарвегіі пры сваім бацьку, каралю Эйрыку. Каля 934 г. разам з бацькам пакінуў краіну і вёў жыццё вандроўнага вікінга на Брытанскіх выспах ды на ўсходзе Еўропы. Рагнвальд знікае з Нарвегіі якраз перад тым, як летапіс паказвае Рагвалода на полацкім княжанні. Скандынаўскія крыніцы сцвярджаюць, што пасля паразы ад Гакана Добрага Рагнвальд у Нарвегію ўжо не вярнуўся ды знайшоў смерць у іншых краях. Таксама вядома, што пасля 999 г. у жывых не засталося ніводнага з сыноў Эйрыка Крывавая Сякера. Усе гэтыя паралелі ў жыццяпісах Рагнвальда і Рагвалода даюць падставу іх атаясамліваць. Хоць, вядома, можна знайсці аргументы і супраць.

Між тым, з Кіева і Ноўгарада паступова насоўваліся трывожныя для Полацка звесткі, небяспечныя і для самога Рагвалода.

## Барацьба братоў

Новы кіеўскі князь Святаслаў па прыкладзе свайго бацькі Ігара даў сынам воласці ў Рускай зямлі. Але пасля смерці Святаслава ў 972 г. яго старэйшы сын Яраполк выгнаў свайго брата Алега з яго ўдзела. Апошні, ратуючыся ўцёкамі, патануў. Даведаўшыся, што адбылося з Алегам, іншы ягоны брат Уладзімір збег з Ноўгарада ў традыцыйным для рускіх князёў IX—X стст. напрамку — «за мора», у Скандынавію. Там ён пачаў збіраць дружыну для барацьбы з Яраполкам. З дапамогай варагаў ён і выгнаў пасаднікаў старэйшага брата з Ноўгарада.

У гэты ж самы час у Полацку княжыў Рагвалод. І гэтае княства было незалежным ад Кіева. Зразумела, што мець такога магутнага саюзніка жадаў кожны з варагуючых рускіх князёў. Таму кіеўскі Яраполк пасватаўся да Рагнеды, дачкі Рагвалода, ды атрымаў згоду на гэты шлюб. Але ноўгарадскі Уладзімір таксама накіраваў сваіх паслоў у Полацк прасіць руку Рагнеды. Рагвалод выбраў кіеўскага князя.




**«Рагвалод Полацкі і Рагнеда». Манета Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (2006 г.).**

За ўсёй гэтай гісторыяй са сватаннем стаялі і сур'ёзныя гандлёвыя супярэчнасці. Полацк панаваў над асобным дзвінскім адгалінаваннем гандлёвых шляхоў і быў натуральным канкурэнтам Ноўгарада, а таксама меў эканамічныя падставы для адасаблення ад Кіеўскай дзяржавы. Тут трэба патлумачыць, чаму так часта ў падзеях IX—X стст. прыгадваецца гандаль. Рэч у тым, што прадуктыўнасць сельскай гаспадаркі ў тыя часы была зусім невысокая — яна забяспечвала выжыванне чалавека і ўтрыманне нейкага адміністрацыйнага апарату. Узбагаціцца ж тады можна было толькі двума шляхамі: рабаўніцтвам альбо гандлем. Транкантынентальны гандаль даваў проста звышпрыбыткі, бо былі арыентаваны на абмен эксклюзіўных тавараў, якіх не выраблялі ці не здабывалі ў іншых мясцовасцях.

Рагвалоду ж у барацьбе паміж Святаслававічамі не заставалася магчымасцяў для лавіравання, ён мусіў прымаць пазіцыі аднаго з бакоў. Да таго ж, увесь папярэдні скандынаўскі досвед падказваў Рагвалоду толькі адзін шлях — ісці да канца. Спагады ад канкурэнтаў і ворагаў у эпоху станаўлення дзяржаў чакаць не варта.

Пра драматычныя падзеі вакол Полацка, Кіева і Мінска чытайце ў працягу «Гісторыі Беларусі».

# 270 Каліноўскіх, 450 Міцкевічаў, 20 Багдановічаў і адзін Дабрыдзень

жывуць у Мінску. Але самае распаўсюджанае прозвішча ў сталіцы — Іваноў.

У картатэцы адрасна-даведачнага бюро ГУУС Мінгарвыканкама каля 7 тысяч Івановых. Следам ідуць Казловы (4700 чалавек), Кавалёвы (4300), Казлоўскія (3900). А замыкаюць пяцёрку лідараў уладальнікі прозвішча Новік (3300 чалавек).

Скарбніцу картатэкі адрасна-даведачнага бюро ўпрыгожваюць носьбіты такіх знакамітых прозвішчаў, як Каліноўскі (каля 270 чалавек), Міцкевіч (450), Ваньковіч (35), Багдановіч (20), Гогаль (50), Жыгімонт (150), Радзівіл (больш за 30). Сярод незвычайных прозвішчаў — Дабрыдзень (1 чалавек), Сонца (55).

**«Мінск-Навіны»**

ЗДАРОЎЕ

## Прагулка — зарука інтэлекту

Навукоўцы з Універсітэта штата Ілінойс даказалі простую залежнасць інтэлекту ад колькасці шпацыраў на свежым паветры. На вуліцы чалавеку ўвесь час даводзіцца рэагаваць на знешнія раздражняльнікі, а гэта актывізуе дзейнасць усяго мозгу цалкам і спрыяе развіццю інтэлекту.

Прафесар Арт Крамэр зазначае: каб значна павысіць інтэлектуальныя здольнасці, патрэбна як мінімум тры шпацыры на тыдзень. Кожны з іх павінен доўжыцца не менш за сорак хвілін.

**ЮУ**

## Танныя лекі выратуюць сардэчнікаў

Лекі пад назвай івабрадзін, якія ўжо выкарыстоўваюцца ў Вялікабрытаніі для лячэння стэнакардыі, змогуць выратаваць тысячы сардэчнікаў. Івабрадзін зніжае хуткасць сэрца, але пры гэтым крывяныя ціск застаецца нязменным. А ў хворых на стэнакардыю лекі зніжаюць працэнт смяротнасці на 26 працэнтаў. З іншага боку, прымаць іх можна толькі пры вельмі сур'ёзных захворваннях — затое каштуе івабрадзін усяго 2 даляры.

**«Бі-Бі-Сі»**

## Кожны восьмы беларус пакутуе ад псіхічнага расстройства

Сапраўдная распаўсюджанасць псіхічных разладаў у Беларусі складае, які ў іншых краінах свету, прыкладна 12—15%. Але да псіхатэрапеўтаў звяртаецца нашмат менш людзей.

У Беларусі на ўліку ў псіхіятрычных установах стаяць каля 200 тысяч жыхароў, г.зн. прыкладна 2% ад усяго насельніцтва. Плюс 170 тысяч алкаголікаў стаяць на ўліку ў наркалагічных дыспансерах.

**ЮУ**

ЛЮБОШЧЫ

# Калі мужчына перастае думаць пра сэкс

### Чаму гэта адбываецца — муж не хоча займацца сэксам з жонкай?

Па-першае, сцвярджаюць спецыялісты, у мужчын, як і ў жанчын, можа быць розная полавая канстытуцыя. У кагосьці яна моцная, і тады сэксуальныя кантакты патрэбныя мужу некалькі разоў на дзень. У кагосьці — сярэдняя, то бок нармальная; такі партнёр будзе задаволены стандартнымі трыма кантактамі на тыдзень. А ў кагосьці — слабая. Такія мужчыны перастаюць думаць пра сэкс, як толькі спадае хваля шалёнай жарсці і маладой закаханасці.

Дзеля Мэрылін Манро, вядома, яны б напружыліся, але ж жонка — яна тут, побач, заўсёды, калі захочаш, навошта напружвацца? Усё б нічога, шлюбны сэкс — гэта не такое ўжо і неабходнае штодня мерапрыемства, ды вось толькі жонка такога мужчыны думае, што ён яе больш не кахае або завёў каханку.

Выйсце? Спакойна пагаварыць.

Па-другое, адзначаюць псіхолагі, жанатыя мужчыны перастаюць думаць пра сэкс тады, калі па-сапраўднаму сур'ёзна думаюць пра працу. Цяпер праца — не проста спосаб самарэалізавацца, нешта камусьці даказаць, стаць найлепшым. Цяпер праца — гэта адказнасць за іншых. І думаць пра яе больш складана.

У мужчын жа таксама баліць галава, яны таксама стамляюцца — насамрэч.

І не было б праблем — ды вось толькі жонкі такіх мужчынаў, хай і задаволеныя матэрыяльна, маральна вельмі нават пакутуюць і думаюць, што муж яе больш не кахае або завёў каханку.

Выйсце? Часцей думаць пра свайго мужчыну, ведаць яго клопат, удзельнічаць у яго жыцці. Адным словам, спакойна размаўляць.

Па-трэцяе, разважаюць псіхатэрапеўты, у многіх жанчын, асабліва маладых мамаў, патрэба ў бурным сэксе, «як да вяселля», робіцца свайго кшталту пунктыкам: ці прывабная я па-ранейшаму? А ці будзе ў нас гэтак жа выдатна, як раней?

Калі сэкс робіцца пунктыкам, мужчына трапляе ў заганнае кола «шлюбнага абавязку».

Ён разумее: ён цяпер павінен, абавязаны. Хто з нас любіць рабіць тое, што абавязаны?

Правільна, ніхто. Але пакуль пунктык у жанчыны не зняты, яна будзе патрабаваць, абвінавачваць, фантазіраваць, даводзіць прычэпкамі: а раптам больш не кахае? Ці каханку завёў.

Выйсце адно: адпусціць сваё жаданне. Перастаць пра яго думаць.

Проста жыць: разам гуляць, глядзець тэлевізар, хадзіць у кіно, размаўляць, урэшце. І муж рана ці позна ізноў задумаецца пра сэкс.

Так што не такое ўжо гэта вялікае гора, калі мужчына раптам перастае думаць пра сэкс.

Урэшце, праўда тое, што ў сямейнага жыцця ёсць мноства рэчаў, пра якія трэба думаць мужчыну. А сэкс — ён нікуды не падзенецца. І абавязкова будзе. Нават калі пра яго асабліва не думаць.

**velvet.by**

З КАМЕНТАЎ НА NN.BY

Не такое ўжо гэта вялікае гора, калі мужчына раптам перастае думаць пра сэкс. Вялікае гора — гэта калі мужчына пачынае думаць пра сэкс, замест таго каб ім займацца.

**Кнехт**



ТЭХНАЛОГІІ

## Стэтаскоп з iPhone аказаўся звышпапулярным

Першапачаткова стэтаскоп для iPhone быў створаны як забаўка, аднак зацікавіліся ім прафесійныя дактары.

Працуе электронны стэтаскоп так: мабільны мікрафон прыкладаецца да груднай клеткі і запісвае шумы сэрца — такім чынам фонакардыяграму можна даслаць па электроннай пошце.

Больш за тры мільёны карыстальнікаў спампавалі iStethoscope і карыстаюцца ім штодзённа. Вытворцы новага стэтаскопа вельмі спадзяюцца, што атрымаецца сертыфікаваць мабільныя тэлефоны ў якасці медыцынскай прылады.

**ЮУ**

ІХ ПРАБЛЕМЫ

## Мост для мышэй каштуе 300 000 даляраў

У паўднёвым Уэльсе над адной з аўтамагістраляў пабудаваныя тры масты, прызначаныя для мышэй. Кошт кожнага — 300 000 даляраў. Рэч у тым, што мышы-соні, што жывуць па абодва бакі дарогі, не могуць перабягаць яе па зямлі — яны жывуць у кронах дрэў і кустоў і ўвогуле рэдка спускаюцца на зямлю.

Без такіх мастоў яны не змогуць сустракацца з папуляцыямі, што жывуць па іншы бок дарогі, а значыць, не змогуць пладзіцца.

Мясцовыя жыхары ў шоку ад сумы, што была выдаткаваная на нейкіх грызуноў.

Аднак мышы-соні знаходзяцца пад пагрозай знікнення і занесеныя ў еўрапейскую Чырвоную кнігу, а значыць, ахоўваюцца законам.

**ЮУ**



У КАШУЛІ

## У Нью-Ёрку самагубца выжыў пасля падзення з 39-га паверха

Жыхар Нью-Ёрка Томас Мэйджыл выжыў пасля спробы самагубства, выкінуўшыся з 39-га паверха жылога хмарачоса на Манхэтэне і прызямліўшыся на задняе сядзенне прыпаркаванага ўнізе аўтамабіля.

Перад скачком 22-гадовы студэнт-музыка на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы Facebook напісаў, што ненавідзіць сваё жыццё.

У выніку падзення Мэйджыл зламаў абедзве нагі, ён знаходзіцца ў крытычным стане. Па словах прадстаўніка паліцыі, ён прабіў верх аўтамабіля Dodge Charger, хуткасць падзення склала амаль 140 кіламетраў у гадзіну.

Відавочцы сцвярджаюць, што студэнт пару разоў праенчыў «Мае ногі!», а пасля страціў прытомнасць.

**СМ**

НЯБЕСНЫЯ БЕГІ

## За паўгода ў бязважкасці касманаўты старэюць у два разы

Бязважкасць разбуральна ўплывае на здароўе касманаўтаў. Амерыканскія навукоўцы высветлілі, што паўгода, праведзеныя ў стане бязважкасці, прыводзяць да дэградацыі мышцаў касманаўта. Чалавек у космасе вельмі хутка робіцца амаль такім жа старым, як 80-гадовыя.

Мышцы касманаўтаў могуць аднаўляцца за месяц на Зямлі, аднак пры прызямленні на Марсе гэтая слабасць будзе разбуральнай, сцвярджаюць навукоўцы з Універсітэта Маркет у амерыканскім штаце Вісконсін.

Навукоўцы зрабілі біяпсію мышцаў дзевяці касманаўтам перад і пасля палёту. Кожны з паддоследных прабыў у космасе больш за шэсць месяцаў. Быў выяўлены разбуральны ўплыў бязважкасці на мышачны тонус касманаўтаў. Да прыкладу, павольныя маторныя адзінкі цягліц астранаўтаў, якія іграюць ключавую ролю ў падтрыманні раўнавагі і паставы, страцілі прыкладна 40% сілы. У выніку іх мышачны тонус аказаўся такім, нібыта касманаўты пастарэлі ў два разы.

Пры гэтым мышцы тых касманаўтаў, хто актыўна займаўся спортам, пацярпелі значна мацней, чым непадрыхтаваных членаў экіпажа.

Велатрэнажор і бегавыя дарожкі, усталяваныя ў МКС, не дапамаглі касманаўтам.

Пры палёце на Марс — а такое падарожжа можа працягнуцца тры гады — уплыў на здароўе касманаўтаў будзе разбуральным. Крыху падтрымаць мышачны тонус магчыма толькі пры больш актыўным харчаванні касманаўтаў, лічаць навукоўцы.

**СМ**

ПЛАСТЫКАВЫ СВЕТ

## Японцы стварылі піва без калорый

Праўда, гэта не піва з хмелю.

Піўны смак напою надае спалучэнне рэгулятараў кіслотнасці, вітаміну С, амінакіслот і араматызатараў. Але японцы спадзяюцца, што новы напой будуць піць тыя, хто адмаўляўся ад піва, каб не псаваць фігуру.

Японцы ўжо выпускалі дзіцячае піва са смакам сапраўднага. Рэкламны слоган у гэтага піва: «Нават дзецям складана вытрываць тэмп сучаснага жыцця не выпіваючы».

**ЮУ**




## ІМПРЭЗЫ



### Аршанская бітва

Прымеркаваны да бітвы пад Оршай фестываль бардаўскай песні адбудзецца **11 верасня**. У фэсце возьмуць удзел **Андрэй Мельнікаў** і малады бард **Ната Пушкарова**. Бардаўскі фэст «Аршанская бітва» ладзіцца штогод **на Крапівенскім полі пад Оршай**. Ён прымеркаваны да Дня беларускай вайсковай славы — перамогі войска Вялікага Княства Літоўскага над войскамі Маскоўскага княства 8 верасня 1514 года. Фэст адбываецца на месцы бітвы — правым беразе Дняпра, дзе ў яго ўліваецца рэчка Крапівенка. Ён доўжыцца ўсю ноч, каб за нядзелю ўдзельнікі змаглі адпачыць і спакойна дабрацца дадому. Фэст праходзіць на адкрытым паветры ля ракі, варта падумаць пра цёплую вопратку, ежу і намёт. Дровы для вогнішча будуць на месцы.

## КАНЦЭРТЫ

### Лісіная нара запрашае: брэтонцы, Камоцкі і джаз з Гродна

**У «Лісінай нары» (вул.Каліноўскага, 32) 5 верасня** — «Брэтонская вечарына ад студыі «**Глорыя**» і групы «**Эйрут**»»: традыцыйная брэтонская музыка і танцы. **7 верасня** — джаз. Дуэт з Гародні: **Сяргей Краўчук** (саксафоны), **Ігар Гіро** (клавішныя). **14 верасня** — джаз: **квартэт Улада Сянкевіча**. **15 верасня** — аўтарскі вечар паэта і музыкі **Алеся Камоцкага**.

### Графіці: «РСП», «Нагуаль» і лаціна

**12 верасня а 18-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — **«Разбітае Сэрца Пацана»**. **14 верасня тамсама а 19-й** — выступае гурт **«Нагуаль»**. **17 верасня а 19-й** — вечар лацінаамерыканскай музыкі з гуртом **Libertad** (Балівія).

### Шапэн у Філармоніі

**15 верасня а 19-й у Малой зале Філармоніі імя Р.Шырмы** — канцэрт фартэпіяннай музыкі «Люстра душы», прымеркаваны да 200-годдзя з дня народзінаў Фрыдэрыка Шапэна. Выканаўца — лаўрэат міжнародных конкурсаў **Аляксандр Палякоў**.

## ВЫСТАВЫ

### Зямля пад белымі крыламі

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** працуе выстава «Зямля пад белымі крыламі», на якой можна ўбачыць працы звыш 300 аўтараў — народных мастакоў Беларусі, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі, стыпендыянтаў спецыяльнага фонду прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Выстаўляюцца і творы, набытыя музеем за апошнія дзесяць гадоў.

### Жывапіс Валянціна Губарава

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) ад 15 верасня да 3 кастрычніка** працуе выстава жывапісу Валянціна Губарава «Звычайна так». Мастак Валянцін Губараў супрацоўнічае з галерэямі Швейцарыі, Германіі, Францыі, ЗША, удзельнічае на аўкцыёнах Christie, Drouot Richelieu і Jaschen.

### У краіне ўзыходзячага сонца

**У выставачнай галерэі Відэацэнтра ГЦ «Сталіца» (пл. Незалежнасці, ніжні ўзровень)** працуе персанальная фотавыстава Ежы Федаровіча (Беласток, Польшча) «У краіне ўзыходзячага сонца». Для Ежы Федаровіча як прырода, так і людзі становяцца невычарпальнай крыніцай натхнення. Сваімі працамі ён паказвае, што, каб заўважыць прыгажосць, не трэба недзе далёка ехаць.

### 25 секунд

**У Малой зале Музея сучаснага выяўленчага мастацтва да 25 верасня** працуе выстава работ П'ера Вільяма Анры «25 секунд». Творца разглядае жанчыну як «пачатак усяго». Гэта і сапраўдная жанчына, і адначасова алегорыя: жанчына — жыццё, жанчына — сімвал, жанчына — ілюзія…

### ЛІТARA. Візуальныя даследаванні паэзіі

**У мінскім Інстытуце імя Гётэ (вул.В.Харужай, 25/3) да 30 верасня** працуе выстава «ЛІТARA. Візуальныя даследаванні паэзіі». Беларускім мастакам былі прапанаваны тэксты сучасных нямецкамоўных паэтаў у арыгінале і ў перакладзе на беларускую мову. Выбраўшы адзін альбо некалькі тэкстаў, кожны ўдзельнік праекта паспрабаваў «даследаваць» яго, ужываючы сродкі выяўленчага мастацтва. Можна ўбачыць творы Руслана Вашкевіча, Міхаіла Гуліна, Сяргея Ждановіча, Сяргея Кірушчанкі, Аляксея Іванова, Аляксея Лунёва, Зоі Луцэвіч, Мікалая Батвінніка, Аляксандра Некрашэвіча, Вольгі Сазыкінай, Антаніны Слабодчыкавай і Сяргея Шабохіна.

### Эстонскія кнігі

**У галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі да 19 верасня** працуе выстава «25 лепшых эстонскіх кніг–2009». Усе кнігі створаныя і праілюстраваныя выключна эстонскімі мастакамі.

### Карціна алеем

**У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а) да 19 верасня** працуе выстава «Карціна алеем». Гэта эксперымент, мэта якога — паглядзець, як сродкамі традыцыйных матэрыялаў могуць быць асэнсаваны творы, знаходзячыяся на перадавым баку сучаснага мастацтва. Фатаграфія, відэа, інсталяцыя, арт-аб'екты і жывапіс алеем. Ці адбудзецца паміж імі дыялог? Наколькі яны далёкія адзін ад аднаго? Ці могуць яны ўзаемадзейнічаць адно з адным?

### Традыцыі і культура Японіі

**У карціннай галерэі імя Г.Вашчанкі (вул.Карповіча, 4, Гомель) да 12 верасня** працуе выстава «Традыцыі і культура Японіі». На выставе экспануюцца прадметы культуры і побыту Японіі, а таксама макеты храмаў і замкаў, наборы лялек, паветраныя змеі…

### Гіганты Ледавіковага перыяду

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 26 верасня** працуе выстава «Гіганты Ледавіковага перыяду» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Мадэлі жывёл для выставы адноўлены па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя камп'ютарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і рыкаюць!

### Свет з вышыні

**У Доме-музеі Ваньковічаў (вул. Інтэрнацыянальная, 33а) да 20 верасня** працуе выстава маляваных мапаў Рубена Атаяна «Свет з вышыні».

## ТЭАТРЫ

**8 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Эсфір»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

**9 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

**10 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**12 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**13 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Жызэль»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»

**14 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр оперы і балета** — «Хаваншчына»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Мужчыны на мяжы нервовага зрыву»

**15 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Шчаўкунок»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Мужчыны на мяжы нервовага зрыву»

## КІНО

# Масква, я люблю цябе!

**«Масква, я люблю цябе»**
зборнік кароткаметражных стужак,
Расія, 2010, 100 хв.
**Ролі выконваюць:** Яўгеній Міронаў, Фёдар Бандарчук, Іван Ахлабысцін, Дзмітрый Дзюжаў.




Гэтая ідэя ўжо апанавала Парыж і Нью-Ёрк, а за яе здзяйсненне б'юцца Шанхай і Рыа-дэ-Жанэйра. Спярша быў Джым Джармуш, які ў сваім зборніку кароткіх кінанавелаў «Ноч на Зямлі» (1991) сказаў, што «не важна, якая драма ці камедыя разыгрываецца ў кадры, абы дзеянне адбывалася ў таксоўцы». Выйшаў дасціпны шырокі зрэз чалавечага жыцця. У 2006 прадусар Эмануэль Бенбігі крыху перайначыў ідэю. «Неістотна што, драма ці камедыя, абы ў Парыжы». Бенбігі запрасіў колькі вядомых рэжысёраў, і кожны на свой лад і розум зняў па кароткаметражным фільме гісторыі, што адбываліся на вулках аднаго горада — Парыжа. Паколькі здымкі парэзанага на стракатыя лапікі фільма не забіраюць шмат часу, можна ж запрасіць процьму знакамітасцяў — як актораў, так і рэжысёраў. А спансараваць будзе гарадскі муніцыпалітэт (гэта ж непрыхаваная рэклама горада, як ні круці).

Пасля шалёнага поспеху «Я люблю цябе, Парыж» і «Я люблю цябе, Нью-Ёрк» расійскі рэжысёр Ягор Канчалоўскі, склікаўшы пад штандары ўвесь цвет расійскай і СНДоўскай кінематаграфіі, зрабіў «Я люблю цябе, Масква».

Тут і драма. Кілер (яго грае Яўгеній Міронаў), чакаючы сваю ахвяру, бачыць праз прыцэл, як невядомыя злачынцы скрадаюць малую дзяўчынку, і робіць свой выбар.

Тут і камедыя. Каханкаў (Джуліяна дэ Капуа і Святлана Іванова), якія, у дадатак, гавораць на розных мовах, пасярод «усяго» заспявае міграцыйная служба. Зласмешная іронія з лютасці маскоўскіх уладаў і хараство безабароннага.

Увогуле, тэма (э)мігрантаў прапісаная ў стужцы з вялікім замілаваннем. У навеле «Пісьмо бабулі Вуйне» кітайская скрыпачка расказвае ў лісце на радзіму, што ў Маскве яна шыкуе і нават ператварылася ў расійскую Ванэсу Мэй, у той час як камера няўмольна фіксуе сцэны жабравання музыканткі-лімітчыцы па пераходах.

Квадратныя расійскія бамбізы і подыумныя дзівы, якія глядзеліся не вельмі пераканаўча ў даўгіх бандыцкіх сагах, у «Я люблю цябе, Масква» выдатна прыдаліся для эфекту схематычнага кіно, дзе важныя не нюансы, а агульны настрой і характэрныя тыпажы. Крывавы і хуткаплынны разбор каўказкіх і люберскіх бандытаў з камічным канцом наганяе геніяльную ў сваёй прастаце думку: «Карэнны масквіч — гэта не той, хто тут нарадзіўся, а той, хто тут выжыў».

…Гэтая ідэя ўжо апанавала Парыж і Нью-Ёрк, за яе здзяйсненне б'юцца Шанхай і Рыа-дэ-Жанэйра. Дык што, чакаем «Minsk, I Love You»?

**ЛК**

# Аднойчы ў Музычным тэатры…

Сёлетні сезон у Дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры, як ва ўсім цывілізаваным свеце, адчыняецца прэм'ерай. На афішы — музычнае рэвю «Аднойчы ў Чыкага» ў пастаноўцы беларускай рэжысёркі Сусаны Цырук.

Доўгіх 11 гадоў сп-ня Цырук увогуле не прыязджала на радзіму, бо яе мастацтва было тут непатрэбна. Гэтыя 11 гадоў былі часам найвялікшага заняпаду для абодвух беларускіх музычных тэатраў. А сп-ня Цырук тым часам ставіла спектаклі ва ўсім свеце, прафесійна расла, атрымоўвала прэстыжныя прэміі.

Сёлета сп-ня Цырук зноў запатрабаваная на радзіме. Пакуль толькі ў ролі пастаноўшчыка, але ў трох розных жанрах. На 28 студзеня прызначана прэм'ера «Снягурачкі» ў Оперы, у сакавіку — «Сільва» ў Музычным тэатры. А цяпер акурат мюзікл, бо «Аднойчы ў Чыкага», як папраўдзе, зусім не рэвю. У яго аснове — славуты брадвейскі мюзікл «У джазе толькі дзяўчаты», моцна перапрацаваны, каб не было праблем з аўтарскімі правамі.

Сп-ня Цырук як дасведчаны драматург перапісала лібрэта, прыдумала цалкам новыя сюжэтныя хады, склала тэксты да новых арыяў і падабрала музыку. Апрача арыгінальных фрагментаў з мюзікла (не блытаць з фільмам!), у спектаклі прагучаць творы яшчэ пяці розных кампазітараў, улучна з хітом Барбры Стрэйзанд.

Пытанне ў тым, ці будзе гэта стылёва? І ці будзе спектакль глядзецца, «як футбольны матч»? Бо менавіта такую задачу ставіла аўтарка — Сусана Цырук. А таксама яе супрацоўнікі — дырыжор Андрэй Галанаў і харэограф Алена Дзмітрыева-Лаўрыновіч.

Як кажа сп-ня Цырук, трупа ў Музычным тэатры — «падарункавая», г.зн. існы падарунак для рэжысёра. Ці атрымаецца падарунак для гледачоў?

Пабачым на прэм'ерных паказах 11, 12, 18 і 29 верасня ў Музычным тэатры.

**Юлія Андрэева**




КІНО

# Беларускія праблемы ізраільскага кіно

## Фестываль ізраільскага кіно ў Мінску.

Сваёй «фішкай» ізраільскія кіношнікі зрабілі нацыянальныя праблемы. Які фільм ні вазьмі — знаёмыя ўсё тэмы!



Араба-ізраільскі канфлікт у нашумелым (сюр)рэалістычным мультфільме «Вальс з Башырам» (2008). Ён – споведзь ізраільцяніна, што спрабуе аднавіць у памяці грамадзянскую вайну ў Ліване.

Праблемы паступовага забыцця маладым пакаленнем трагедый мінулага ў «Зроблена ў Ізраілі» (2001). Тут фантазія рэжысёра дазволіла прасачыць за апошнімі днямі апошняга нацыста, якога выкрадаюць ізраільскія спецслужбы.

«Візіт аркестра« (2007): праз памылку егіпецкі аркестр трапляе не ў Дом культуры вялікага ізраільскага места, а ў горад-спадарожнік, які ўвогуле не мае ніякіх культурных установаў. Вуснамі гераіні, ізраільскай правінцыялкі, на пытанне незнаёмца «Дзе знаходзіцца Дом арабскай культуры?» рэжысёр Эран Калірын вельмі аб'ёміста, паагульначалавечаму, адказвае: «Няма тут арабскай культуры, няма тут і габрэйскай культуры, тут увогуле ніякай культуры няма!» «Візіт аркестра» — меланхалічная камедыя, іранічная меладрама пра адзіноту двух людзей, араба і габрэйкі, што сустрэліся ў гэтай горкай правінцыі з назовам Зямля.

Для ізраільскага кінематографа, які аб'ёмамі вытворчасці падобны да беларускага (тут за год здымаецца колькасць фільмаў, якія можна палічыць па пальцах адной рукі), амаль кожны новы фільм павінен рабіцца паспяховым. У 2000-я ў ізраільцян гэта стала ўдавацца. Аднак гэтаму поспеху папярэднічалі шэрыя дзесяцігоддзі непрыкметных стужак, поўных празмернасцяў і перакосаў.

Абсалютнае неўмяшанне дзяржаўнай ідэалогіі ў творчы працэс дазволіла рэжысёрам перахварэць на чарнуху, збыткоўную галізну ў кадры і недарэчныя камедыі-весялухі. І вось: пасля сотняў спробаў і памылак колькасць перарасла ў якасць, а цяжкасці ізраільскай гісторыі — у каларыйную спажыву для творчасці. «Дамарослы» перастае быць абразлівым словам. Нацыянальныя праблемы засталіся нацыянальнымі праблемамі, але гучаць яны сталі на поўны голас, міжнародна, ды ў іх іншыя народы знаходзяць крышку свайго. Каб быць пачутым, трэба казаць ціха, з тутэйшым вымаўленнем.

**Ліза Кавальчык**

**У кінатэатры «Цэнтральны»**

Найбольш цікавым падаецца першы дзень фестывалю, **14 верасня. «З кім бы пабегаць»** — стужка паводле твора класіка ізраільскай літаратуры Давіда Гросмана. Сам раман зрабіўся ў Ізраілі бестселерам, ён меў строгі сацыяльны характар, але пасля кінематаграфічнай пераапрацоўкі зрабіўся проста захапляльнай тынэйджарскай стужкай пра барацьбу падлеткаў супраць уладальніка наркаманскага прытона і супраць сваіх фобій. **Пачатак у 18.30.**

І вядома, **«Ліван» (2009)** — фільм-лаўрэат Венецыянскага кінафэсту. Ваенная драма адбываецца ў танку ў першы дзень Ліванскай вайны 1982 г. Уражлівы твор, які апісвае магутны зрух людской свядомасці. Людзі, убачаныя праз перыскоп. **Пачатак у 21.00.**

**15 верасня.** Дзень дакументальнага кіно. **«Тараб» (2009)** — аповед пра арабскія карані ізраільскай культуры. **«Могілкавы клуб» (2006)** — пра пакаленне Халакоста. **Пачатак у 18.30 і 21.00 адпаведна.**

**16 верасня.** Дзень камедыяў. Камедыйная драма пра змаганне людзей з лішняй вагой **«Памер мае значэнне» (2009)**, **«Зніклыя выспы» (2008)** — жыццёвая трагікамедыя ў антуражы ізраільскіх 1980-х. **Пачатак у 18.30 і 21.00.**



# Вінаград: карысны і небяспечны

Не такі вінаград і бяскрыўдны, як гэта нам падаецца. Калі ведаць пра вінаградныя сакрэты, то «пераржыць» вінаградны сезон можна не толькі ў сваё задавальненне, а яшчэ і карысна.

### Вінаградная дыета

За тры дні, што яна доўжыцца, трэба з'есці чатыры кілаграмы вінаграду: 500 грамаў у першы дзень, паўтара кілаграма ў другі і цэлыя два ў трэці. Мэта — скінуць два кілаграмы вагі. Затое праблемы са страваваннем вам забяспечаныя — скурка вінаграду жорсткая і дрэнна пераварваецца. Пры гэтым есці нічога іншага нельга. Таму, перш чым распачаць дыету, падумайце, ці вартыя таго гэтыя два кілаграмы вагі.

### Як правільна выбраць вінаград

Калі пакупнікі бачаць на ягадах карычневыя плямы, жаданне браць такі вінаград прападае. І дарма: менавіта гэтыя плямы кажуць, што вінаград выспеў і мае найлепшую якасць.

А вось плямы на галінцы нікога не спыняюць — вось гэта памылка: свежы вінаград заўжды будзе мець зялёную галінку без плямаў.

Калі на выгляд вінаград свежы, а галінка — карычневая, значыць, ён захоўваўся ў лядоўні, і свежым яго можна назваць вельмі адносна.

Дактары лічаць: чым цямнейшы вінаград — тым ён лепшы. У костачках знаходзіцца вялікая колькасць антыаксідантаў, дзейнічаюць яны мацней за вітамін Е.

Для людзей з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы вінаградны сезон — як свята. Бо смачнейшых і карыснейшых адначасова лекаў за гэтыя ягады няма. У вінаградзе шмат калію, а калій павышае тонус сардэчнай мышцы.

Таксама вінаград дапамагае пры вірусных захворваннях, яго можна спажываць дзеля прафілактыкі грыпу, што асабліва актуальна восенню.

### Каму нельга вінаград

Але адначасова вінаград называюць самай шкоднай ягадай, якую толькі можна ўявіць. Для людзей, што пакутуюць ад карыесу, ён — найгоршы вораг. Агромністая колькасць кіслот у ім разбурае зубную эмаль. Шкодны вінаград і праз вялікую колькасць цукру.

Калі маеце праблемы са страўнікам, вінаград лепш не ўжываць: ён уздзейнічае як наймацнейшы раздражняльнік. Калі ж у каго язва ці парушаны каліевы абмен — пра вінаград лепш не думаць.

Падлеткам рэкамендаваныя зялёныя сарты вінаграду, бо ад цёмных можа ўзнікнуць анемія. Асабліва гэта тычыцца цёмнага вінаграднага соку. Ні ў якім разе ні яго, ні самі ягады нельга ўжываць цяжарным жанчынам.

Пры стаматалагічных захворваннях (такіх як стаматыт) ад вінаграду варта адмовіцца, бо ён абвастрае іх. Напрыклад, замест тыдня, які стаматыт звычайна трымаецца, вінаград дапаможа «расцягнуць» хваробу ўдвая.

### Вінаград і яго «спадарожнікі»

Мода на выкарыстанне вінаградных костачак у якасці касметычнага і медыцынскага прэпарату ўзнікла нядаўна. Выпускаюцца крэмы на аснове вінаградных костачак, новыя лекі ад сардэчна-сасудзістых захворванняў утрымліваюць іх.

Вінаградным лісцем таксама можна лячыцца. Ад рыматусу і праблемаў са зрокам народная медыцына прапануе халодным настоем з 350 грамаў вінаграднага лісця і трох літраў вады. Усё гэта трэба настойваць тры дні. Карысны такі адвар пры падагры і дыябеце.

Вінаград варта ўжываць асобна ад сырога малака, тлустай ежы, гародніны, піва і іншых спіртных напояў.

У прынцыпе, кожны здаровы чалавек можа з'ядаць у дзень 500 грамаў вінаграду, і ніякіх пабочных эфектаў не будзе назірацца, а асалоду можна атрымаць — усё ж такі з большага для гэтага мы яго і купляем.

**Юрась Ускоў**

# У свеце фобій

Восень — час, калі фобіі абвастраюцца.

Восень — час цяжкі. І не ў апошнюю чаргу ад таго, што восенню абвастраюцца ўсе нашы фобіі. Гэта тычыцца не толькі людзей, што маюць праблемы з псіхікай, але і ўсіх астатніх — у кожнага з нас ёсць, прынамсі, адна (а насамрэч нашмат больш) фобія.

«Наша Ніва» высветліла, як змагацца з фобіямі і як зрабіць восень максімальна камфортнай.

### Чаго баяцца людзі

Спіс фобій, што афіцыйна існуюць, настолькі вялікі, што сярэдніх памераў брашуру можна скласці ўжо з іх пераліку.

Самыя распаўсюджаныя — клаўстрафобія і агарафобія. Гэта жах, які выклікае ў першым выпадку — закрытая прастора, а ў другім — адкрытая. Калі, напрыклад, вы не можаце сядзець у пакоі з адчыненымі дзвярыма — гэта не проста лёгкі неспакой, так праяўляецца ваша фобія.

Іншае пытанне — ці небяспечна гэта. Толькі ў рэдкіх выпадках фобія пераходзіць у клінічны стан, тады ўжо трэба псіхалагічная дапамога. А большасць з нас жыве са сваімі фобіямі, і нават вельмі нядрэнна.

Але два разы на год фобіі маюць тэндэнцыю абвастрацца. Тады ўжо трэба пераходзіць да рашучых дзеянняў, каб зрабіць камфортным сваё жыццё і жыццё сваіх блізкіх.

**10 самых пашыраных фобій**

Акрафобія — боязь вышыні

Андрафобія — боязь мужчынаў

Аквафобія — боязь вады

Аўтафобія — боязь адзіноты

Кардыяфобія — боязь хваробы сэрца

Клаўстрафобія — боязь замкнёнай прасторы

Гемафобія — боязь крыві

Некрафобія — боязь трупаў

Ніктафобія — боязь цемры

Панафобія — боязь усяго на свеце

### Што рабіць

Пры нараджэнні чалавек не мае фобій увогуле — яны ўсе набытыя. Мы «навучыліся» баяцца.

Адсюль вынікае першы спосаб змагання з фобіяй — навучыцца замяняць страх на рэлаксацыю. Гэта так званая дэсенсібілізацыя — спалучэнне ўяўленняў, якія выклікаюць страх, з расслабленнем.

У яе ўваходзіць тры этапы: на першым вучымся рэлаксацыі, прычым не простай, а моцнай, якая па



ўздзеянні будзе амаль настолькі ж эфектыўнай, як лекі. Пасля складаем спіс сваіх страхаў (моцных стрэсавых сітуацый). А пасля імкнемся спалучыць рэлаксацыю і разбор сваіх страхаў, пачынаючы ад самага простага і заканчваючы самым цяжкім. Мінус у гэтага спосабу адзін — у хатніх умовах яго вельмі складана выканаць, і без дапамогі псіхатэрапеўта не абысціся.

Дэсенсібілізацыя застаецца найбольш надзейным спосабам развітацца з фобіяй.

Самым папулярным метадам застаецца паход да доктара, але не заўжды гэта варты шлях. Ад фобій лекары могуць і не пазбавіць, а вось ад грошай — лёгка. Пішуць пацярпелыя: «Кожны сеанс каштаваў 200 даляраў, сеансаў было 10. Кожны раз доктар казаў, што мы ўжо амаль вылечылі маю фобію, а сам выпісваў мне рэланіум у шалёных дозах. Дзякуй богу, я яго не прымала». Таму, калі вы ўжо вырашылі звярнуцца да доктара, выбірайце надзейны варыянт.

Ёсць і новы, тэхналагічны спосаб — з дапамогай віртуальнай рэальнасці чалавека «пераносяць» у страшную для яго сітуацыю. Пад кантролем псіхолага чалавек паступова пачынае разумець усю абсурднасць свайго страху.

**ЮУ**

УМЕННЕ ЖЫЦЬ

# Малако супраць часночнага паху



Часнок, акрамя сваіх карысных якасцяў, мае і заўважны мінус — яго пах настолькі моцны, рэзкі і непрыемны, што ад яго пакутуюць усе, хто знаходзіцца побач.

Яшчэ адна непрыемная ўласцівасць гэтага паху — «перабіць» яго складана, тым больш што ён змешваецца з іншымі пахамі і ўтварае шалёны букет. Але навукоўцы ўрэшце знайшлі аптымальны варыянт — малако. Прычым малаком трэба не запіваць часнок, а піць яго ў час жавання — тады эфект мацнейшы. А лепш за ўсё змяшаць часнок з малаком. Навукоўцы Універсітэта Агаё даказалі, што менавіта ў малацэ ёсць элементы, якія амаль адразу знішчаюць смурод часнаку. Чым тлусцейшае малако, тым лепш яно «працуе».

Навукоўцы раяць ні ў якім разе не адмаўляцца ад часнаку: пералік хвароб, ад якіх ён перасцерагае, уключае ў сябе нават рак.

**ЮУ**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Тушаныя грыбы

**450 г грыбоў, паўкубка смятаны або яйкі, цыбуля, масла, перац, соль.**

Грыбы вымыць, пакроіць на кавалкі, abліць варам. Злажыць у рондаль, дадаць цыбулю, масла, троху вады і тушыць. Пасаліць, папярчыць, уліць смятану. Замест смятаны можна ўбіць яйкі, замяшаць, але не заварваць, і падаваць.

### Грыбы з бульбай

Вараную бульбу пакроіць на скрылікі і падсмажыць з цыбуляй на масле. Грыбы ўтушыць, пакласці наверх бульбу. Разбоўтаць 3 яйкі ў паўкубку смятаны і заліць наверх, паставіць на нейкі час у печ, каб яйкі запякліся.

**З кнігі «Вялікалітоўская (беларуская) кухарка», выдала М.Станкевічыха, Нью-Ёрк, 1959**

## Прыватныя абвесткі

**КВАТЭРА**

**Беларускамоўная пара здыме** кватэру ў Мінску. Т.: (029) 287–33–57, (033) 703–88–18.

**ПРАЦА**

**Пячнік-пенсіянер дапаможа** суайчыннікам адрамантаваць ці змайстраваць любую печ, камін. Т.: (029) 609–53–61.

**ВАНДРОЎКА**

**Запрашаем** у падарожжа 12 верасня па маршруце: Мінск—Мікелеўшчына—Правыя Масты— Белавічы—Струбніца—Пескі—Самуйлавічы Дольныя—Вялікая Рагозніца—Крамяніца—Мінск. Т.: (17) 262–73–43, (029) 111–73–32.

**ТАНЦЫ**

**У кавярні «Жар-птушка» адкрываецца чарговы танцавальны сезон.** У Парку Горкага 9 верасня (чацвер) а 19–й на вас чакаюць дуда, гармонік, іскрыпка й бубен. Штосчацвер — беларускія і суседскія народныя танцы.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) На аўтобусны прыпынак прыйшлі дзве матулі, дзве дачкі і бабуля з унучкай. Колькі чалавек прыйшло?

2) На матацыкл з каляскай можна сесці тром чалавекам. Падышлі 2 бацькі, 2 сыны, 1 дзед і 1 унук. Усе яны размясціліся на матацыкле і паехалі. Як гэта магло быць?

3) У легкавую машыну селі цешча з зяцем, муж з жонкай, маці з дачкой, бабуля з унучкай ды дачка з бацькам. Ці можа такое быць?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**Фолк-фэст «Камяніца» прайшоў выходнымі ў Строчыцах. Выступалі Вольскі, «Тройца», «Бан Жвірба». Увесь збор ад фэсту пайшоў на развіццё Музея народнай архітэктуры і побыту. А ўвогуле на фэсце кожны знаходзіў сваё.**




**Дзень адчыненых дзвярэй у падраздзяленні спецназа МУС. Эстафета.**




**У мінскай каталіцкай Катэдры з пачаткам навучальнага года асвячалі школьныя сумкі, дзённікі і сшыткі — каб не насілі «двоек».**




**Бабіна лета.**




**Красуні ўсіх памераў і мадыфікацый узялі ўдзел у конкурсе «Міс Грудзі Беларусі», які прайшоў выходнымі ў Мінску.**

## Анекдоты

* * *

— Мама, а навошта настаўнікам на 1 верасня кветкі?

— Каб яны думалі, што ў іх свята.

* * *

— Тата, а ў бабы Клавы якое поўнае імя?

— Клаўдзія.

— А мы з хлопцамі паспрачаліся, што Клавіятура...

* * *

— Вы вельмі падобны да майго трэцяга мужа!

— А колькі іх было ўсяго ў вас?

— Два!

* * *

Прадавец шаўрмы, мяняючы пялюшкі свайму дзіцяці, чыста машынальна дадаў салату і маянэз.

* * *

— Хто сказаў, што крыкам і гвалтам ад людзей нічога не дамажэшся? Вы не сутыкаліся з маёй двухмесячнай дачкой...

* * *

З афіцыйнага паведамлення Нацбанка: даляр вырас і больш нас не слухаецца!

* * *

Даішнік спыняе кіроўцу:

— Чаму ездзіце не прышпіліўшыся?

— А вы хіба не рады?

## «НН» сто гадоў з вамі

**Самы высокі чалавек у свеце — гэта беларус.** Віцебскай губерні Хведар Махоў мае росту больш як сажань. Праз яго пярсцёнак лёгка праходзіць рубель.

**«НН». № 35. 1910**

**Сяргей Чыслаў:** «У Беларусі самае сур'ёзнае святкаванне 8 верасня было, калі афіцэры запасу прымалі прысягу на плошчы Незалежнасці ў 1992 годзе. Тады Казлоўскі, на той час міністр абароны, які цяпер апазіцыянер нямераны, быў супрацьпрыняцця тае прысягі. Я лічу, што тое 8 верасня якраз падштурхнула беларускае кіраўніцтва да прывядзення да прысягі на вернасць Беларусі ўсяго войска і ўсіх сілавых структураў».

**«НН». №35. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**

1) Трое (бабуля, яе дачка і ўнучка). 2) Было 3 чалавекі. 3) Можа, усяго селі 4 чалавекі.

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 07.09.2010.
Замова № 4365.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10034